ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 Г.
№ 29 (897) 18 —24 ЛІПЕНЯ 2009 Г.

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

WWW.KIMPRESS.BY



С. 4

С. 14

С. 9

С. 15

АБ'ЯДНАНЫЯ ЛІРАЙ БЕЛАРУСІ

16 ліпеня васемнаццаты акорд "Славянскага базару ў Віцебску" прагучаў у канцэрце яго закрыцця!

Развітваючыся з фестывалем, кожны з яго гасцей і ўдзельнікаў прывёз у сэрцы на сваю радзіму гукі Ліры Беларусі, што паяднала іх на непаўторны ліпеньскі тыдзень. А вось сваю матэрыялізаваную ў Гран-пры "Ліру", а таксама "Ліры" ўладальнікаў II прэміі ўраджэнец Гомеля Дзмітрый Даніленка, нашы канкурсанты Андрэй Коласаў і Маша Новік, несумненна, паставяць у першым шэрагу сваіх узнагарод.

Фота Віктара ТАЛОЧКІ і Аляксандра ХІТРОВА, БелТА

С. 6 — 9

Для павышэння эфектыўнасці і якасці

Кіраўнік дзяржавы ўнёс змяненні ў склад савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Адпаведны Указ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 ліпеня.

Старшынёй савета прызначаны намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, заслужаны артыст Беларусі Генадзь Давыдзька, яго намеснікам — першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка.

У сувязі з кадравымі назначэннямі і ў мэтах перыядычнай ратацыі членаў савета фонду ў яго склад унесены пэўныя змяненні. У прыватнасці, у склад савета фонду ўключаны Віктар Бабарыкін, Аксана Волкава, Леанід Гуляка, Алена Падаляк, Уладзімір Пракапцоў, Анатоль Ярмоленка.

Прыняцце дакумента будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці і якасці дзейнасці прэзідэнцкага фонду па падтрымцы культуры і мастацтва.

За выдатныя творы і дасягненні

Рашэннем Кіраўніка дзяржавы заснаваны 5 прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” і 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва ў памеры 350 базавых велічынь кожная. Адпаведны Указ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 ліпеня.

Згодна з Указам прэмія “За духоўнае адраджэнне” прысуджаецца штогод за выдатныя творы літаратуры і мастацтва і (або) актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае зберажэнню і прымнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцей і мастацка-маральных традыцый, ідэй чалавекалюбства, дабрачыннасці і міласэрнасці. Яе лаўрэатамі могуць стаць дзеячы культуры, літаратуры, мастацтва, архітэктуры, аховы здароўя, адукацыі, навукі, сацыяльнай абароны, сродкаў масавай інфармацыі, прыёмныя бацькі, апекуны, свяшчэннаслужыцелі, іншыя асобы, а таксама аўтарскія, творчыя і іншыя калектывы работнікаў.

Спецыяльная прэмія Кіраўніка дзяржавы дзеячам культуры і мастацтва прысуджаецца штогод за выдатныя дасягненні ў галіне выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, музычнага, тэатральнага, харэаграфічнага, эстраднага, цыркавога мастацтваў, архітэктуры, дызайну, кінавідэамастацтва, літаратуры, журналістыкі, тэлебачання і радыёвяшчання, крытыкі і мастацтвазнаўства, а таксама народнай і аматарскай мастацкай творчасці, музейнай і бібліятэчнай справы, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне. Яе лаўрэатамі могуць стаць дзеячы культуры, літаратуры, мастацтва, архітэктуры, аўтарскія, творчыя і іншыя калектывы работнікаў.

Указам вызначаны парадак вылучэння і разгляду кандыдатур прэтэндэнтаў на прэміі. Права вылучаць суіскальнікаў прэміі (спецыяльнай прэміі) прадастаўлена ўсім арганізацыям, дасягненні супрацоўнікаў якіх адпавядаюць устаноўленым патрабаванням, у абстаноўцы адкрытасці і галоснасці.

Матэрыялы вылучэння да 1 кастрычніка года, за які прысуджаюцца прэміі, у адпаведнасці з падпарадкаванасцю накіроўваюцца ў рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамы, Мінскі гарвыканкам, іншыя дзяржаўныя органы і арганізацыі.

Унесеныя матэрыялы разглядаюцца на пасяджэннях калегій рэспубліканскіх органаў кіравання, выканкамаў, калегіяльных органаў іншых арганізацый. Па іх выніках прымаецца рашэнне аб вылучэнні суіскальнікаў прэмій, якое да 15 кастрычніка года, за які прысуджаюцца прэміі, накіроўваецца ў савет фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Абмеркаванне атрыманых матэрыялаў будзе праводзіцца на пасяджэнні савета фонду. Па яго выніках савет фонду да 25 кастрычніка года, за які прысуджаюцца прэміі, прымае рашэнне аб рэкамендацыі суіскальнікаў. На яго падставе Урад рыхтуе праекты ўказаў Прэзідэнта і ўносіць іх Кіраўніку дзяржавы да 5 снежня года, за які прысуджаюцца прэміі.

Прэмія (спецыяльная прэмія) прысуджаецца ўказам Прэзідэнта і ўручаецца Кіраўніком дзяржавы або ўпаўнаважанай ім службовай асобай 7 студзеня, у дзень праваслаўнага Раждаства Хрыстовага.

Нарматыўным прававым актам таксама ўстаноўлена, што лаўрэатам прэміі (спецыяльнай прэміі) уручаюцца дыпломы, якія пацвярджаюць факт іх прысуджэння, і зацверджаны апісанні гэтых дыпломаў.

Прыняцце ўказа дасць магчымасць на самым высокім дзяржаўным узроўні адзначаць заслугі выдатных людзей, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры і мастацтва, гуманітарнай, асветнай і дабрачыннай дзейнасці.

Паводле паведамленняў Прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Свет пра фальклор

З 13 па 18 ліпеня Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праводзіцца Міжнародная навуковая канферэнцыя “Сусветная фальклорная спадчына: мінулае, сучаснае, перспектыўныя накірункі даследавання”.

Гэтым разам у ёй прынялі ўдзел, акрамя беларускіх дэлегатаў, 50 запрошаных навукоўцаў з 22 краін свету. Гэта прадстаўнікі вядучых даследчых школ Еўропы, Паўночнай Амерыкі, Азіі і Аўстраліі: Абердынскага, Эдынбургскага і Кардыфскага універсітэтаў (Вялікабрытанія), Гарвардскага універсітэта (ЗША), Нацыянальнага аўстралійскага універсітэта, Кёльнскага універсітэта (Германія), Лісабонскага універсітэта (Партугалія), Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта (Расія) і многіх іншых, а таксама супрацоўнікі нацыянальных акадэмій навук розных еўрапейскіх краін.

Галоўная мэта навуковага міжнароднага мерапрыемства, па словах старшыні рабочай групы па падрыхтоўцы і правядзенні канферэнцыі, прафесара, доктара філалагічных навук, загадчыка аддзела фальклярыстыкі і культуры славянскіх народаў ІМЭФ НАН Беларусі Аляксандра Марозава, — гэта падагульненне вынікаў даследавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны краін і народаў свету ў першым дзесяцігоддзі XXI стагоддзя і выпрацоўка комплекснай праграмы навуковай работы найбуйнейшых даследчых цэнтраў свету па дадзенай праблематыцы на перыяд да 2020 года.

Правядзенне мінскай канферэнцыі як знакавага міжнароднага форуму будзе садзейнічаць актывізацыі ўзаемакарысных кантактаў беларускіх навукоўцаў з прадстаўнікамі іншых краін і дазволіць падрыхтаваць шэраг сумесных праектаў з даследчыкамі з краін Еўрапейскага саюза.

Акрамя навуковых пасяджэнняў і “круглых сталоў” па разнастайнай тэматыцы, міжнародным дэлегатам была прапанавана і вялікая культурная праграма: госці пазнаёміліся з адметнасцямі беларускай сталіцы, наведалі Музей гісторыі і археалогіі Акадэміі навук Беларусі, Батанічны сад, Нацыянальны музей гісторыі і культуры, Музей народнай архітэктуры і побыту.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Універсітэцкі фармат “...Акадэміі”

Можна шмат казаць пра перспектывы захавання і папулярызацыі нашай спадчыны, разнастайныя пагадненні і законы ў гэтай сферы, аднак, у першую чаргу, неабходна бачыць плён іх рэалізацыі. Важным крокам у гэтым стаўся унікальны міжнародны праект “Нясвіжская акадэмія”, які цягам 15 гадоў рэалізуецца ў нашай краіне пры падтрымцы Міністэрства культуры. Яго тэма сёлета — ахова і выкарыстанне гісторыка-культурных аб’ектаў і ансамбляў.

Юбілейны курс Міжнароднай летняй школы ў гэтым годзе прайшоў на базе Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Таксама арганізатарамі праекта выступілі польскія партнёры — Нацыянальны цэнтр даследаванняў і дакументацыі гістарычных помнікаў горада Варшавы і Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны суседняй дзяржавы. Намеснік міністра культуры Уладзімір Грыдзюшка пад час адкрыцця XV курса адзначыў, што ў беларуска-польскіх стасунках па ахове гісторыка-культурнай спадчыны назіраецца станоўчая дынаміка. У чарговы раз пацвярджэннем гэтаму стала “Нясвіжская акадэмія”. Намеснік міністра падкрэсліў, што для слухачоў летняй школы створаны добрыя ўмовы для навучання. Да таго ж, у другой палове гэтага года ў іх будзе магчымасць наведаць Варшаву і пазнаёміцца з вопытам польскіх калег.

За два тыдні слухачы курса з Беларусі і Украіны — пераважна навуковыя супрацоўнікі музеяў — мелі магчымасць пазнаёміцца з сучаснымі распрацоўкамі ў сферы аховы спадчыны народа. Апрача таго, лекцыі летняй школы былі прысвечаны прынцыпам састаўлення дакументацыі, ахове і фарміраванню гісторыка-культурнага ландшафту, разглядаліся праграмы добраўпарадкавання Аўгустоўскага канала і польскага палацава-паркавага ансамбля-музея ў Вілянове. Не абышлося і без практычнай часткі: вучэбнага аб’езду і знаёмства з аховай і добраўпарадкаваннем гістарычных частак Мінска, Нясвіжа і Міра.

І ўсё ж, як адзначыў адзін са стваральнікаў праекта — старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп, паводле задумы, першы год навучання — гэта пераважна тэарэтычная падрыхтоўка. Менавіта таму за два тыдні слухачы курса, апрача засваення лекцый, мусілі вызначыцца з тэмамі дыпломных работ, звычайна звязаных з мясцінамі, адкуль яны прыехалі.

Працяглы час з прычыны фінансавых цяжкасцей ішла размова пра закрыццё гэтага праекта, але пасля аналізу дасягненняў “Нясвіжскай акадэміі” гэтае пытанне адпала само па сабе. Мяркуйце самі: каля 200 чалавек, сярод якіх — і архітэктары, гісторыкі, музеязнаўцы, ужо прайшлі курс Міжнароднай летняй школы і працуюць у сферы аховы і рэстаўрацыі гістарычных помнікаў. Больш за тое: яны прысвяцілі сваю дзейнасць тэме дыпломнага даследавання. Як зазначыў Уладзімір Гілеп, сярод вынікаў папярэдніх выпускнікоў “Нясвіжскай акадэміі” — і ўдзел у рэстаўрацыі Аўгустоўскага канала, Опернага тэатра, сядзібы Міцкевіча ў Завоссі.

Кастусь АНТАНОВІЧ

У Мемарыяльнай зале Дома літаратара адбылася знакавая падзея: першае пасяджэнне Грамадскага савета па маральнасці. Яго заснавальнікамі выступілі Беларуская Праваслаўная Царква і Саюз пісьменнікаў Беларусі. Удзел у форуме прымалі таксама прадстаўнікі іншых найбольш уплывовых у нашай краіне канфесій і рэлігій, а таксама вядомыя дзеячы палітыкі, культуры, адукацыі, спорту.

Без агульных фраз

Старшыня Грамадскага савета па маральнасці Мікалай Чаргінец адзначыў, што супольныя намаганні будуць скіраваны не на цэнзуру культуры і прэсы, але на падтрыманне ініцыятыў і праектаў, звернутых на развіццё маральнага патэнцыялу грамадства, абарону духоўнасці народа.

У адпаведнасці з Палажэннем Савета плануецца стварэнне групы і камісіі па асобных сферах, да прыкладу, інфармацыйнай і адукацыйнай. Да таго ж, Савет можа ініцыяваць правядзенні канферэнцый, семінараў, “круглых сталоў” з мэтай прыцягнення грамадскасці да праблем выхавання моладзі. Для гэтых мэт, па словах Мікалая Чаргінца, заўсёды адкрыта Вялікая зала Дома літаратара.

Як зазначыў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, у аснове працы Савета мусіць ляжаць змаганне з апанаваўшым свет крызісам маральнасці, бездухоўнасцю. У той жа час, ім было падкрэслена, што зацверджаны дакумент не з’яўляецца нечым нязменным. Пасля азнаямлення з ім членаў Савета і грамадскасці будуць магчымыя, на думку Мітрапаліта, пэўныя карэкціроўкі.

Але ўжо цяпер, у адпаведнасці са сваёй галоўнай мэтай — сцвярджэнне ў грамадстве высокіх маральных прынцыпаў — Савет можа даваць ацэнкі і высновы па грамадскіх і дзяржаўных праектах, выносіць меркаванні наконт твораў літаратуры і мастацтва, падручнікаў, дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку асобных публікацый.

Народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч падкрэсліла, што сёння неабходна казаць ужо пра канкрэтныя справы, бо “супрацьстаяць заганам грамадства агульнымі фразамі немагчыма”. Таксама пад час сходу гучалі думкі і пра развіццё шчыльнага супрацоўніцтва з айчыннымі заканадаўцамі і дзяржаўнымі органамі, у аснове якога — клопат пра будучыню моладзі.

Пад час пасяджэння Савета было падпісана таксама і пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Беларускай Праваслаўнай Царквой і Саюзам пісьменнікаў Беларусі.

К.А.

На здымку: пад час пасяджэння.
Фота Кастуся ДРОБАВА

Аб’ява*

Палац Рэспублікі
запрашае для працы
Ў ПРЭЗІДЭНЦКІМ АРКЕСТРЫ
Рэспублікі Беларусь:

дырэктара аркестра *(галоўнага адміністратара калектыву)*;
вядучага рэдактара *(менеджэра)*;
загадчыка музычнай часткі *(кіраўніка артыстаў-вакалістаў)*.

Патрабаванні: вышэйшая адукацыя, вопыт працы з творчымі калектывамі.

Дадатковая інфармацыя па тэлефонах: 229-90-50, 229-91-09, 229-91-78; для рэзюмэ: факс 229-91-84; e-mail: yag@palace.by.

Увага!

Аб’яўлены прыём заявак

ад прафесійных мастакоў на ўдзел у конкурсным праглядзе эскізных праектаў ніжэйпералічаных мастацкіх твораў для афармлення інтэр’ераў МІРСКАГА ЗАМКА:

— габелены (6 штук);
— плафонны роспіс столі;
— пано насценнае керамічнае;
— роспіс падлогі;
— камплект вырабаў з керамікі (кашпо, пласты, пано);
— скульптура (бронза).

Неабходную інфармацыю для падрыхтоўкі эскізаў можна атрымаць у Нацыянальным мастацкім музеі па тэл.: 227-56-72.

Заяўкі мастакоў на ўдзел у конкурсным праглядзе павінны быць накіраваны ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь да 15 жніўня 2009 г.

Савет для каардынацыі

Пра падтрымку беларускіх дыяспар за мяжой ішла гаворка пад час прэс-канферэнцыі Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь Леаніда Гулякі, што адбылася напярэдадні V З’езда беларусаў свету.

У прыватнасці, было зазначана, што наспела неабходнасць стварэння Каардынацыйнага савета кіраўнікоў беларускіх аб’яднанняў за мяжой пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Па словах Леаніда Гулякі, на сённяшні дзень ужо распрацаваны праект загаду аб яго стварэнні, асноўныя палажэнні, вызначаны склад Савета, куды ўвайшло адзінаццаць чалавек. Акрамя гэтага, Леанід Паўлавіч плануе прапанаваць далучыцца да дзейнасці савета і дэлегатаў чарговага З’езда беларусаў свету, у рабоце якога ён таксама будзе прымаць удзел.

Але і зараз дыяспарам аказваецца пасільная дапамога. Як адзначыў Леанід Гуляка, беларуская дзяржава рэгулярна спрыяе плённым ініцыятывам суайчыннікаў за мяжой. У прыватнасці, дыяспары атрымліваюць літаратуру на роднай мове, сімволіку, нацыянальныя строі і музычныя інструменты. Таксама ў Беларусі штогод арганізуюцца курсы для кіраўнікоў калектываў народнай творчасці беларускіх дыяспар.

На прэс-канферэнцыі закраналася і пытанне аб падпісанні дамоўленасцей аб узаемадапамозе дыяспарам апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей з дзяржаўнымі органамі ўлады, дзе жывуць этнічныя беларусы. Як падкрэсліў Леанід Гуляка, ужо падпісаны міжведамасныя дамоўленасці з Расіяй, Украінай, Малдовай і Літвой, а ў працэсе распрацоўкі — ратыфікацыя аналагічных дакументаў з Эстоніяй, Латвіяй, Казахстанам, Арменіяй і Узбекістанам.

Рэпін у срэбры

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь увёў у абарачэнне срэбную памятную манету “І.Рэпін”, якая выпушчана ў рамках Міжнароднай манетнай праграмы “Мастакі свету”, наміналам 20 рублёў.

Манета мае прамавугольную форму памерам 40,00 х 28,00 мм. З пярэдняга і адваротнага бакоў манеты — выступаючы кант па перыметры прамавугольніка. Бакавая паверхня манеты без насечкі.

На пярэднім баку манеты размешчаны: у цэнтры — фрагменты карціны Іллі Рэпіна “Восеньскі букет”; злева ўверсе — рэльефная выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, вакол яе — надпіс: “Рэспубліка Беларусь”, у ніжняй частцы — намінал: “20 рублёў”, проба сплаву і фірменны (таварны) знак Манетнага двара Польшчы, дзе яна і адчаканена.

На адваротным баку манеты размешчаны: злева — рэльефнае адлюстраванне аўтапартрэта Іллі Рэпіна, пад ім — надпіс: “І.Рэпін” і гады жыцця мастака: 1844 — 1930; справа — выява музея-сядзібы Рэпіна ў Здраўнёве, што на Віцебшчыне, пад ёй — адлюстраванне палітры і пэндзляў.

Паводле паведамлення ўпраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

У “...Люстры” — права

Грамадства практычна кожнай краіны ў сваёй дзейнасці арыентуецца найперш на дзяржаўную Канстытуцыю. У часы Сярэднявечча аналагічную ролю адыгрывалі іншыя дакументы, у прыватнасці, магдэбургскае права. Так, Мінску гэты прывілей быў нададзены 510 гадоў таму.

Убачыць, што ўяўлялі з сябе прававыя старажытныя дакументы, дапаможа выстаўка “Саксонскае люстра” і магдэбургскае права — асновы Еўропы”, якая адкрылася ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь.

Выстаўка, падрыхтаваная Зямельным цэнтрам палітычнай адукацыі Федэральнай зямлі Саксонія — Ангальт, расказвае, галоўным чынам, пра гісторыка-прававы партрэт Цэнтральнай Германіі і адлюстроўвае пытанні ўзнікнення самага значнага ў Германіі зборніка права — “Саксонскага люстра”.

Акрамя таго, яна распавядае пра галоўныя прынцыпы магдэбургскага гарадскога права, якое, пачынаючы ўжо з XII ст., надавала гарадам і іх жыхарам шырокія свабоды, маёмасныя правы і гандлёвыя прывілеі. Экспанаты выстаўкі акцэнтуюць ўвагу на ўплыў “Саксонскага люстра” на еўрапейскае правазнаўства. Наведвальнікі змогуць пазнаёміцца таксама з друкаванымі выданнямі XVI і манетамі XII — XIII стст. У цеснай звязцы з магдэбургскім правам “Саксонскае люстра” трапіла ў розныя вобласці Усходняй і Цэнтральнай Еўропы: Сілезію, Польшчу, Украіну, Беларусь, Багемію, Маравію, Славакію, Венгрыю. Такім чынам, яно стала асновай для развіцця юрыдычнай сістэмы на шырокіх прасторах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Дарэчы, першым горадам, які атрымаў магдэбургскае права ў Вялікім княстве Літоўскім, была Вільня — у 1387 годзе. Потым яно прыйшло ў 1390 годзе ў Брэст, а затым Гродна, Слуцк, Полацк. У XVIII ст. магдэбургскім правам валодалі амаль усе буйныя і сярэднія гарады на тэрыторыі сённяшняй Беларусі.

Наш кар.

На ілюстрацыях: старонка з “Саксонскага люстра”.

Па слядах выступлення “Культуры”

Музей пераедзе ў Зембін

У № 19 “К” за 2009 г. пад рубрыкай “Родная зямля: час крэатыву” быў змешчаны артыкул “Як захаваць музей народнай славы ў Іканах?”. Гаворка ў ім вялася пра дзейнасць знакавай для Барысаўскага раёна ўстановы культуры — Іканскага музея народнай славы, узнімаліся пытанні аб размяшчэнні музея ў іншым будынку. Публікацыя была накіравана на рэагаванне. Вось што адказаў начальнік упраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Анатоль Акушэвіч:

“Па інфармацыі, выкладзенай у артыкуле, паведамляем наступнае.

Іканскі музей народнай славы быў заснаваны ў 1964 годзе на базе сярэдняй школы як грамадскі. З 1977 года займеў статус дзяржаўнага музея народнай славы, з 1988 года ўвайшоў у склад Барысаўскага аб’яднанага музея як структурнае падраздзяленне.

Пасля пажару ў 2006 годзе экспазіцыя музея часова была размешчана ў Іканскай базавай школе. Супрацоўнікі ДУ “Барысаўскі аб’яднаны музей” сабралі для ўзнаўлення экспазіцыі дакументы, фотаздымкі, аднавілі 89 адзінак ваеннага рыштунку.

Прапановы аб размяшчэнні музея ў памяшканнях базавай школы і дзіцячага садка разглядаліся ўпраўленнем культуры аблвыканкама сумесна з Барысаўскім райвыканкамам яшчэ ў 2006 годзе. Аднак гэтыя будынкі не адпавядаюць патрабаванням для размяшчэння музея і захавання музейных прадметаў: памяшканне школы — 1955 — 1957 гг. пабудовы, драўлянае, патрабуе рэканструкцыі; памяшканне ж дзіцячага садка пабудавана ў 1964 — 1965 гг., драўлянае, абкладзенае цэглай, з 1998 года не эксплуатуецца, неабходна правядзенне экспертызы тэхнічнага стану, рэканструкцыі, што патрабуе значных капітальных укладанняў.

У сувязі са скарачэннем колькасці дзяцей школьнага ўзросту ў вёсцы Іканы была закрыта школа. У 2007 годзе ў музеі праведзена толькі 129 экскурсій, у 2008 г. — 138. Бюджэтныя затраты на ўтрыманне музея за 2008 г. склалі 28,5 млн. руб.

Улічваючы, што ў навукова-асветніцкай рабоце значнае месца займаюць арганізацыя і правядзенне мерапрыемстваў патрыятычнага напрамку, а асноўнымі наведвальнікамі музея з’яўляюцца школьнікі, вырашана перавесці музей народнай славы ў аграгарадок “Зембін” і, пасля завяршэння капітальнага рамонту, размясціць яго ў памяшканні Зембінскага сельскага дома культуры”.

Прэміі прысуджаны найлепшым!

Напрыканцы чэрвеня Прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі прысудзіў прэміі 2009 года ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці з наданнем звання лаўрэата, уручэннем Ганаровага знака, дыплома і грашовай узнагароды.

За творы прозы, паэзіі і драматургіі былі вылучаны дзве прэміі. Іх атрымалі паэт Віталь Гарановіч за кнігу вершаў “Саракі” і намеснік дырэктара РВУ “Літаратура і мастацтва”, пісьменнік Міхаіл Пазнякоў.

За музычныя творы, канцэртна-выканальніцкую дзейнасць прысуджана прэмія Заслужанаму калектыву Рэспублікі Беларусь ансамблю народнай музыкі “Бяседа” Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь (мастацкі кіраўнік — Леанід Захлеўны) за актыўную канцэртную дзейнасць і прапаганду беларускай народнай песні ў краінах блізкага і далёкага замежжа.

Уладзімір Гасцюхін за пастаноўку спектакля “Механический человек” па п’есе М.Варфаламеева ў Тэатры-студыі кінаакцёра і Мікалай Князеў за стварэнне дакументальных фільмаў “Вароты”, “Белорусский космос”, “Материя образа” ўзнагароджаны прэміяй у намінацыі “За работы ў галіне тэатральнага мастацтва і кінамастацтва”.

Прэмія за творы жывапісу, скульптуры, графікі і прыкладнога мастацтва прысуджана Уладзіміру Вішнеўскаму за стварэнне афортаў і мастацкае афармленне кніг у 2005 — 2008 гг. і Аляксею Жукоўскаму (Панцюку-Жукоўскаму) за работы з серыі персанальных выставак (2005 — 2008 гг.) пад агульнай назвай “Пад мірным небам — Маладая Беларусь”.

За актыўную работу па развіцці народнага мастацтва і самадзейнай творчасці працоўных прэмію атрымаў Аляксандр Буры — дырэктар Палаца культуры ААТ “Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод”.

За выдатныя дасягненні аматарскіх калектываў мастацкай творчасці Прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі прысудзіў прэмію ўзорнаму ансамблю танца “Віза-ві” Дома культуры чыгуначнікаў Аршанскай дыстанцыі грамадзянскіх збудаванняў ТРУП “Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі”, г. Орша (кіраўнік — Алеся Рукаль).

А ў галіне журналістыкі прэміямі ўзнагароджаны Міхаіл Шыманскі — за творчую работу “Мая вера — мая Беларусь”, апублікаваную ў прэсе ў 2005 — 2008 гг.; Іван Курбека (пасмяротна) — за літаратурна-мастацкае выданне “Запрашэнне ў музей”; Ганна Александровіч — за цыкл публіцыстычных нарысаў пад агульнай назвай “Судьбы людские” (2005 — 2006 гг.).

Ул. інф.

“Дэбют” — на “Сузор’і”

Маладая беларуская актрыса Паліна Сыркіна адзначана дыпломам грамадскага журы “За лепшы жаночы дэбют” на XVII Міжнародным фестывалі акцёраў кіно “Сузор’е”, які праходзіў у расійскай Цвяры. Такую адзнаку беларуска атрымала за працу ў нядаўняй прэм’еры Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” — драме “Кадэт” Віталя Дудзіна.

Беларуская дэлегацыя на “Сузор’і” стала адной з самых цікавых. Узначальвала яе дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны, старшыня Гільдыі кінаакцёраў Святлана Сухавей. А папулярны акцёр Анатоль Кацянёў уваходзіў у склад журы фестывалю. Акрамя беларусаў, гасцямі “Сузор’я”, што сёлета адзначыў сваё 20-годдзе, было каля 100 акцёраў з Расіі, Украіны, Польшчы, якія прайшлі на “зорнай дарожцы” на Тэатральнай плошчы перад Цвярскім драматычным тэатрам. Акрамя названага горада, фестывальныя мерапрыемствы прайшлі яшчэ ў шасці населеных пунктах вобласці.

Міжнародны фестываль акцёраў кіно накіраваны на прапаганду акцёрскай прафесіі і штогод арганізуецца Гільдыяй кінаакцёраў Расіі. Спецыфіка “Сузор’я” — у тым, што і ў журы, і ў адборачнай камісіі ўдзельнічаюць толькі акцёры, якія ацэньваюць працу выключна сваіх жа калег. Гэтым разам галоўнымі прызамі акцёрскага журы, якое ўзначальваў Эмануіл Вітарган, былі адзначаны расійскія акцёры Дар’я Мароз і Алег Янкоўскі (пасмяротна).

Антон СІДАРЭНКА

Фота Юрыя ІВАНОВА

Учора з вялікім поспехам завяршыліся гастролі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў Пінску. Як зазначыў мастацкі кіраўнік тэатра Мікалай Пінігін, купалаўцы не маглі не наведаць са спектаклямі сталіцу беларускага Палесся — “радзіму” знакамітай “Пінскай шляхты” В.І. Дуніна-Марцінкевіча.

З “Пінскай шляхтай”

Акрамя самой “Пінскай шляхты”, якая і адкрывала гастролі тэатра на сцэне Гарадскога дома культуры, купалаўцы прадставілі жыхарам Пінска яшчэ некалькі сваіх культавых спектакляў: неўміручую “Паўлінку” Я.Купалы, “Памінальную малітву” Р.Горына, а таксама найноўшую прэм’еру тэатра — камедыю “Вячэра з дурнем” Ф.Вэбера.

Акрамя таго, на сцэне Палескага драматычнага тэатра купалаўцы сыгралі “Вечар” А.Дударава і “Баладу пра каханне” В.Быкава. Дарэчы, апошні спектакль быў паказаны акурат у дзень 65-годдзя вызвалення Пінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Т.К.

Будаўніцтва перліны беларускага сярэднявечнага дойлідства — Лідскага замка — распачалося ў 1323 годзе па загадзе вялікага князя літоўскага Гедыміна. Магутная фартэцыя павінна была супрацьстаяць нападам крыжакоў, а месцілася яна ў балоцістым краі, там, дзе рэчка Каменка ўпадае ў раку Лідзею — на створаным з пяску і гравію штучным востраве. Пабудаваны абарончы замак-кастэль меў чатыры сцяны, дзве вежы. Самая вялікая сцяна павернута на поўнач — адтуль ішла пагроза, — а перад ёй знаходзіўся глыбокі роў, запоўнены вадой...

Задача сучасных дойлідаў увогуле, як лічыць галоўны архітэктар і навуковы кіраўнік праекта рэстаўрацыі гэтага помніка, архітэктар інстытута "Мінскпраект" Наталля БАРАНЕЦ, — аднавіць колішнія славутасці на роднай зямлі. Адной з "першых ластавак", разам з Нясвіжскім і Мірскім замкамі, станецца Лідскі кастэль. Пры гэтым велічная пабудова павінна ўвабраць у сябе і функцыянальнасць XXI стагоддзя.

"Музейнае заданне" Лідскага кастэля

Як "упісаць" XXI стагоддзе ў замак Гедыміна?

Як бачыў вялікі князь

— Наша творчая група, — распавядае Наталля Міхайлаўна, — займаецца праектам рэстаўрацыі Лідскага замка з 2005 года. Напачатку зрабілі эскізны праект, сабралі матэрыялы, вялікая праца ажыццёўлена па фіксацыі гістарычных звестак. Лідскі замак — кастэль, ён не з'яўляецца магнацкім, таму не павінен трактавацца ў адным спісе з Любчанскім, Гальшанскім, якія таксама патрабуюць аднаўлення. Хочацца верыць, што ў даволі хуткім часе мы зноў ператворымся ў краіну замкаў. Зрэшты, нельга казаць, што ў нас мала помнікаў архітэктуры. У нас толькі пад Мінскам іх вялікая колькасць! Гэта закінутыя палацы, сядзібы, паркі... Галоўнае, каб дахі

былі ў гэтых будынках, бо без іх пабудовы цяжэй аднаўляць. У Лідскім жа замку не было даху, вежы яшчэ ў 1702 годзе былі ўзарваны шведамі. У 1794-м разбурэнне давяршылася. Пасля гэтага замак не аднаўляўся....

Працуючы на аб'екце, убачылі: спробы правесці рэстаўрацыю былі і раней. Вядома, што "Белрэстаўрацыя" пачала займацца ў 1990-я аднаўленнем Лідскага замка. Але на той час не было ні адпаведнага фінансавання, ні рабочых. У выніку работы на аб'екце аказаліся выкананымі далёка не па праекце, што прывяло з цягам часу да пэўных разбурэнняў. Цяпер у замку — няўстойлівая заходняя сцяна, бо не зусім добра выканана бутавая кладка — старадаўні будаўнічы прыём, калі паміж двух бакоў кладкі засыпаецца раствор з цэглай, рэшткамі камянёў. Сцяна аказалася непакрытай, і, трапляючы ў гэтую поласць, вада ў халодную пару года замярзала. Не да канца закансервавана і паўднёва-заходняя вежа, якую таксама не накрылі. Сёння на гэтых участках працуюць даследчыкі.

— Якое аблічча будзе нададзена Лідскаму замку ў XXI стагоддзі?

— Мы ў сваёй працы над праектам кіраваліся мэтай надаць замку аблічча, якое ён меў у XIV стагоддзі, прыстасаваўшы яго пры гэтым для сучасных патрэб. На тэрыторыі двара, паводле археалагічных раскопак, якія праводзіліся Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, раскрыты падмуркі збудаванняў. Мы адраджаем дом каменданта, казармы, кузню, навесы для коней, галерэю, два калодзежы. Плануюцца рэканструкцыя адной вежы і аднаўленне другой... Хутка павінны распачацца будаўнічыя работы. Дазвол на гэта даецца пасля праходжання экспертызы па архітэктурным праекце, да чаго мы зараз і рыхтуемся. Да гэтага ён быў ужо адобраны Рэспубліканскай мэтадычнай радай па аднаўленні помнікаў архітэктуры.

Увогуле, калі параўноўваць рэстаўрацыю ў Лідскім замку з працай у Нясвіжы і Міры, варта заўважыць: апошнія пасля аднаўлення будуць выконваць іншую, чым Лідскі, функцыю. Таму збіраемся зрабіць на нашым аб'екце ўсё максімальна блізкім да таго, якім яно было ў мінуўшчыне.

— Цікава, а па сваіх памерах Лідскі замак меншы, скажам, за Мірскі?

— Калі мець на ўвазе аб'ём збудаванняў — дык, напэўна, меншы. Калі ж браць плошчу — разам з навакольнымі тэрыторыямі яна складае 4,2 гектара. Таму Лідскі замак атрымліваецца не меншы за Мірскі. Ён выкананы старажытнымі будаўнікамі ў выглядзе трапецыі, вельмі набліжанай да квадрата. Каля замка праглядаюцца рэшткі рова. Мы яго пакідаем. Мяркуем аднавіць і стаў. Дарэчы, Лідскі райвыканкам заказаў праект адраджэння воднай сістэмы, які выконвае спецыялізаваны праектны інстытут. У нашу ж задачу, апроч рэстаўрацыі Лідскага замка, уваходзіць аднаўленне замкавай тэрыторыі, стварэнне сквера на перакрыжаванні вуліц Камсамольская і Энгельса, дзе прадугледжана вялікая колькасць скульптур, у іх ліку — конная. Мяркуецца, што вершнікам з часам стане славуты князь Гедымін — заснавальнік Лідскага замка.

— Нясвіжкі замак — узор італьянскага барока. У выпадку з Лідскім — архітэктар невядомы. Паводле гістарычных звестак, замак будаваўся тры гады. Пасля будаўніцтва ў яго мелася толькі адна — паўночна-ўсходняя — вежа і адзін уваход, праз сто гадоў дабудавалі другую. Між іншым, першапачаткова Лідскі замак быў часткова драўляны.

— Ці грунтавалася ваша даследаванне па аднаўленні знешняга выгляду замка па замалёўках Орды, Драздовіча, Пешкі?

Фантазія Орды, або "Круглага" — не было!

— Вы, пэўна, вывучалі вопыт рэстаўратараў Літвы, Польшчы. Ці падобны нашы пабудовы такога тыпу на замкі краін-суседак?

— Так, мы вывучалі вопыт Польшчы, Літвы. Сапраўды, нашы замкі падобны да іхніх. Дарэчы, падобныя збудаванні сучасных Беларусі і Літвы стваралі раней своеасаблівы абарончы ланцужок з кастэляў, або каштэляў: Меднікі, Трокі, Ліда... У Навагрудку ж, да прыкладу, замак быў трохі іншы — каралеўскі. Увогуле ж, лічу, нельга параўноўваць, скажам, Тракайскі замак з Лідскім. Літоўскі трохі іншы па стылі. Дарэчы, яго рэстаўрацыя вядзецца ўжо даўно. У нас жа іншыя мэты і тэрміны работ.

Пакуль мы маем архітэктурны праект. Элементы дэкору там будуць таксама выкананы — прадстаўлены рэчы, зробленыя паводле ўзораў, знойдзеных археалагамі: кафля для пячэй, коўка, мячы. Мы вывучалі і чэшскія замкі, цікавіліся германскім вопытам, у прыватнасці, адроджаным замкам і старажытным цэнтрам Нюрнберга па архіўных фота і дакументах. Але там захавалася нашмат болей матэрыялаў, чым у нас. Таму нам давялося выкарыстоўваць мастацкія рашэнні.

— Італьянскія госці, якія бачылі нашы замкі, сцвярджаюць, што многія з іх пабудаваны іхнімі архітэктарамі...



— Гэта не абсалютна дакладныя дакументы: у іх шмат мастацкага вымыслу. У Орды вежа Лідскага замка адлюстравана круглай, хаця, паводле археалагічных даных, круглага тут не было нічога... Пры распрацоўцы праекта мы вывучалі старажытныя гравюры Гродна. Стараліся выкарыстоўваць тое, што бліжэй за ўсё да рэгіёна, таму будынкі Прыбалтыкі, Польшчы і Гродзенскай вобласці нас цікавілі перш за ўсё.

Ухіл на драўляныя элементы

— Якія будаўнічыя матэрыялы мяркуецца ўжываць пры аднаўленні велічнага Лідскага замка?

— Я не сказала б, што пры рэстаўрацыі будуць ужывацца сучасныя матэрыялы. Калі лічыць, што цэгла — сучасны будаўнічы матэрыял, дык яна будзе прымяняцца. Вядома, ужывём дрэва, бут і бетон (апошні ж, як вядома, вынайдзены яшчэ да нашай эры). У прынцыпе, пры рэстаўрацыі нічога лепшага не знойдзеш за натуральны камень для брукавання. Для дахаў скарыстаем керамічную чарапіцу і драўляныя гонты. У асноўным, ухіл робіцца на ўжыванне якраз-такі драўляных элементаў.

— Ці плануеце запрасіць да працы майстроў, якія могуць выканаць працы паводле традыцыйных узораў?

— У нас у вёсках і сёння ёсць майстры, якія рубяць хаты, могуць выканаць усе неабходныя злучэнні. Існуюць спецыялізаваныя будаўнічыя арганізацыі, чые спецыялісты працуюць па старажытных тэхналогіях. Мы імкнёмся, каб мастацкае рашэнне замка ў Лідзе, яго інтэр'ераў адпавядалі духу і стылю XIV — XV стагоддзяў.

Чаго не будзе — дык гэта ацяплення залаў печкамі і радыятарамі, якія бачныя на сценах. Усё гэта можна "схаваць".

Аднаўленне і патрэбнасці горада

— У беларускіх архітэктараў назапашваецца ўжо ўласны вопыт у справе рэстаўрацыі і адраджэння помнікаў архітэктуры. На чым, на вашу думку, асабліва варта акцэнтаваць увагу спецыялістам?

— Мы працуем толькі над праектам. Самы складаны момант ва ўсім працэсе — яго рэалізацыя. І вельмі шмат залежыць ад таго, як і кім ён будзе ажыццёўлены. Над нашым праектам працуе не толькі наша архітэктарская група, а таксама і канструктарская. Падключаны ўсе памежныя аддзелы: спецыялісты ў галіне тэхнікі, электрыкі, сантэхнікі. Замак будзе насычаны ўсялякімі камунікацыямі, усім неабходным, чаго патрабуе XXI стагоддзе.

Пры ўсім тым, нельга сказаць, што Лідскі замак — навадзел. Гэта будзе аднаўленне, але ўсё ж такі — з элементамі патрэбнасцей горада. Сучасная Ліда выкарыстоўвае замак для правядзення культурных, спартыўных мерапрыемстваў. У заданні па праектаванні вызначана: стварыць на тэрыторыі замка падабенства арэны для правядзення рыцарскіх турніраў і спартыўных спаборніцтваў, канцэртаў. На дварэ прадугледжана змясціць баявую тэхніку XIV стагоддзя, усталяваць пад'ёмны мост, прабіць княжацкія вароты, якія былі зроблены спецыяльна для вяселля Ягайлы і Соф'і Гальшанскай. Аднаўляецца дом з фахверхавымі фасадамі...

— Наколькі ўсе гэтыя новаўвядзенні будуць гарманіраваць са старажытнасцю?

— У здзяйсненні ўсяго названага я не бачу асаблівых праблем. Пытанне пра тое, што нічога нельга чапаць, а рабіць толькі так, як было, не стаіць рубам. Існуе шмат прыкладаў, уключаючы досвед Грэцыі, Італіі, іншых краін Еўропы, дзе выкарыстоўваюцца і насычаюцца сучаснымі інжынернымі збудаваннямі старажытныя замкі. Трэба ўлічваць і той момант, што ў Беларусі вельмі шмат разбурана і, на жаль, не аднаўлялася цягам многіх гадоў. Ёсць такія прыёмы: пакідаць старажытныя помнікі як руіны, рабіць кансервацыю. Лідскі замак патрабуе аднаўлення. Калі ўлічыць, што ён знаходзіцца ў цэнтры горада, а там не захавалася гістарычная забудова, дык замак для горада — асноўная дамінанта. Наколькі я ведаю, лідчане з нецярпеннем чакаюць, калі замак адновіцца. І, перш за ўсё, Лідскі замак будзе музеем. Мы шчыльна працавалі з аддзелам культуры Лідскага райвыканкама, з краязнаўчым мастацкім музеем, якія далі нам такое планавае заданне. Ды і плынь турыстаў у Беларусь усё павялічваецца. Лідскі замак якраз знаходзіцца на шляху турыстычнага патоку — паміж Нясвіжам, Мірам, Гроднам. Побач з тэрыторыяй замка месціцца гатэль. Таму горад можа актыўна развіваць турыстычны бізнес.

Наталля КІРПІЧЭНКАВА

Магчыма, справа ў паспешлівасці?

Сёння прапануем чытачам два лісты з пошты "К", у якіх закранаецца гістарычная тэматыка ў кантэксце культурнай прасторы краіны. Адзін з іх утрымлівае водгук на Зводны план устаноўкі манументальных збудаванняў у Рэспубліцы Беларусь, да абмеркавання якога мы запрашалі нашых чытачоў. Іншы — разгорнутую рэцэнзію на адно з апошніх энцыклапедычных выданняў.

Сёлета выдавецтвам "Беларуская энцыклапедыя" імя П.Броўкі была выдадзена новая кніга — "Города, местечки и замки Великого княжества Литовского". Гэтае выданне, як адзначана ў звароце да чытача, разлічана "на историков и самые широкие читательские круги". Нельга не адзначыць высокі ўзровень паліграфічнага выканання, багатую ілюстрацыйнасць і прэзентацыйны характар кнігі. Да ўсяго, выданне абагульняльнага тома пра гісторыю гарадоў, мястэчак і замкаў ВКЛ наспела ў навуковых колах. І гэта варта ўсяляк вітаць.

Выданне стала б добрым падарункам і замежным гасцям, спецыялістам у медыявістыцы, але… Яно ўтрымлівае столькі памылак і недакладнасцей, што наўрад ці можа называцца энцыклапедыяй.

Кніга складаецца з аглядавых нарысаў па гісторыі гарадоў, мястэчак і замкаў Вялікага княства Літоўскага і алфавітнай часткі, дзе змешчаны артыкулы пра асобныя населеныя пункты. Нарысы, аўтарамі якіх з'яўляюцца доктар гістарычных навук Ю.М. Бохан і кандыдат гістарычных навук А.Б. Доўнар, напісаны на высокім навуковым узроўні, і іх змест не выклікае нараканняў. Аднак некаторыя асаблівасці перакладу тэкстаў Ю.М. Бохана з беларускай на рускую мову, выкананага рэдакцыяй выдавецтва, выклікаюць здзіўленне.

Сапраўдны "перл" знаходзім у нарысе "Развитие фортификации ВКЛ в 14 — 16 вв.". Аўтарскую назву раздзела "Гарадскія (мескія) умацаванні" рэдакцыя пераклала на рускую мову як "Городские (местечковые) укрепления"! У выніку такога непісьменнага перакладу ў самім раздзеле з'явілася інфармацыя пра "строительство местечковых укреплений" у сталіцы дзяржавы — Вільні! Для спецыялізаванага выдання гэта занадта грубая памылка. Супрацоўнікам рэдакцыі трэба было мець хоць бы агульнае ўяўленне пра тое, што такое мястэчка і чым гэты тып населенага пункта адрозніваецца ад горада. Дарэчы, пра гэта можна прачытаць у першым з аглядавых нарысаў.

Здзіўленне выклікае мова шэрагу цытат з гістарычных дакументаў, змешчаных у артыкулах энцыклапедыі. Наогул, крыніцы можна цытаваць ці на мове арыгінала, ці ў перакладзе на мову выдання (у дадзеным выпадку — рускую). Цяжка сказаць, якімі прынцыпамі кіравалася ў гэтым пытанні рэдакцыя. Некаторыя вытрымкі з дакументаў XVI — XVIII стагоддзяў у кнізе гучаць на сучаснай беларускай мове. А фрагмент пастановы Варшаўскага сейма 1764 г. (мова арыгінала — польская) увогуле падпаў пад беспрэцэдэнтную апрацоўку. У тэксце нарыса, напісанага Ю.М. Боханам на беларускай мове, гэтая цытата гучала па-беларуску, што цалкам лагічна. Пры перакладзе рэдакцыя энцыклапедыі транслітарыравала тэкст цытаты рускімі літарамі і апублікавала наступнае: "…порушэння юрысдикций городских судов, распоряженнев по тэстаментах городских владаннев и обтяжарванней гэтых владаннев долговыми обовязательствами". Застаецца толькі ўпэўніць чытача, што ўжытая "трасянка" не мае ніякіх адносін да мовы арыгінала дакумента.

■■■

Цяпер звернемся да артыкулаў алфавітнай часткі энцыклапедыі. На вялікі жаль, крытэрыі іх падбору не зусім зразумелыя. Паведамлена, што ў выданні "предпринята попытка описать все известные в указанный период относительно крупные населенные пункты — города, местечки, большие села, где находились замки, и сами замковые комплексы". Аднак значнай колькасці сапраўды важных для ВКЛ гарадоў і мястэчак не знайшлося месца на старонках кнігі. Нават пры беглым прагляде энцыклапедыі кідаецца ў вочы адсутнасць артыкулаў пра Астроўна, Баркулабаў, Варонічы, Ейшышкі, Ішкальдзь, Косава, Крошын, Лынтупы, Нізгалава, Обальцы, Поразава, Ракаў, Свянцяны, Скідзель, Сноў, Усваты, Чарсцвяты. Спіс забытых мястэчак можа быць значна пашыраны.

На гэтым фоне асаблівую ўвагу прыцягваюць артыкулы пра "современные крупные города Беларуси, которые в период ВКЛ существовали как деревни". Да гэтай катэгорыі адносяцца Баранавічы, Ганцавічы, Добруш, Дрыбін, Жабінка, Жыткавічы, Калінкавічы, Асіповічы, Светлагорск. Мэты такой "рэтраспекцыі" зразумець вельмі цяжка. Якое значэнне мелі, напрыклад, Баранавічы ці Дрыбін у разглядаемую эпоху? Аднак і гэты прынцып вытрымліваецца далёка не заўсёды. Незразумела, на якой падставе ў кнігу ўключаны артыкулы пра Бакшты, Гудагай і Арэхаўна. Няўжо яны з'яўляюцца "современными крупными городами"? Можа быць, у эпоху ВКЛ гэтыя вёскі былі мястэчкамі ці ў іх існавалі замкі? Па меншай меры, у алфавітных артыкулах адпаведная інфармацыя адсутнічае.

Як вынікае з табліцы, мястэчка Сіроцін (Шумілінскі раён) атрымала магдэбургскае права ў 1767 г. Для населеных пунктаў Беларусі гэта далёка не шараговая падзея. Тым не менш, артыкула пра Сіроцін у кнізе няма.

Здавалася б, пытанні храналогіі надання гарадам і мястэчкам ВКЛ магдэбургскага права павінны мець прынцыповае значэнне для рэдакцыі гэтага спецыялізаванага выдання. Аднак прыведзеныя ў кнізе даныя пра канкрэтныя населеныя пункты нярэдка маюць узаемавыключальны характар. На вялікі жаль, рэдакцыя не патурбавалася пра ўзгадненне дат зводнай табліцы "Привилеи на магдебургское право городам на территории Беларуси", складзенай А.Б. Доўнарам, з датамі асобных артыкулаў энцыклапедыі. Чытачу застаецца толькі здагадвацца, у якім годзе атрымалі магдэбургскае права Магілёў (1577 ці 1561), Радашковічы (1792 ці 1569), Віцебск (паўторна, 1641 ці 1644), Бешанковічы (1634 ці 1635), Ула (1648 ці 1577).

Адзначым, што ва ўсіх спрэчных выпадках дакладную інфармацыю змяшчае табліца А.Б. Доўнара. Першапачаткова яна рыхтавалася для энцыклапедыі "Вялікае княства Літоўскае" і ўключала даныя пра гарады ВКЛ, якія ў наш час знаходзяцца на тэрыторыі Літвы, Беларусі, Польшчы, Расіі і Украіны. У дадзеным жа выданні, дзе прысутнічаюць артыкулы пра гарады ўсіх земляў ВКЛ, прыведзена толькі частка табліцы, якая адносіцца да тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь. Неабходна таксама звярнуць увагу на тое, што Веліж, насуперак прадстаўленай у адпаведным артыкуле інфармацыі, ніколі не атрымліваў магдэбургскага права.

Шэраг артыкулаў алфавітнай часткі кнігі ўтрымлівае дадаткі ў выглядзе дакументаў і матэрыялаў, крытэрыі падбору якіх таксама малазразумелыя. Так, пасля артыкула "Мстиславль" змешчана грамата вялікага князя літоўскага Аляксандра князю Міхаілу Жаслаўскаму на валоданне гарадамі Мсціслаў і Мглін (1499 г.). У той жа час, у самім артыкуле інфармацыя пра надание адсутнічае. Калі гэтая падзея не мае гістарычнага значэння, то навошта перадрукоўваць дакумент? У адваротным выпадку лагічна было б згадаць гэты факт у тэксце артыкула. Такім жа чынам суадносяцца са сваімі дадаткамі артыкулы "Пинск", "Чернигов", "Щучин". Многія дакументы — напрыклад, размешчаныя пасля артыкулаў "Ивенец" і "Ивье", — ніяк не звязаны з вынесенымі ў загаловак кнігі паняццямі "горад", "мястэчка" і "замак". Што ілюструюць такія дадаткі? І чаму ў рускамоўным выданні значная частка дакументаў прадстаўлена ў перакладзе на сучасную беларускую мову?

Таксама не зразумела, навошта спатрэбілася перадрукоўваць "Сведения о древнем Случеске" з дарэвалюцыйнай "Живописной России" ў дадатку да артыкула "Слуцк". Няўжо, на думку рэдакцыі, сам артыкул настолькі слабы, што неабходна дубліраваць яго аб'ёмным нарысам неэнцыклапедычнага характару?! Да таго ж, у "Живописной России" змешчаны звесткі пра многія населеныя пункты ВКЛ… Такое ж дзіўнае ўражанне пакідае фрагмент "Истории Российского государства" С.М. Салаўёва, размешчаны пасля артыкула "Чашники".

■■■

Дастаткова арыгінальным чынам выданне знаёміць чытача "с развитием градостроительства и фортификации". Мне некалькі разоў давялося пабываць на Вялікай Кітайскай сцяне, і я заўсёды лічыў яе самым грандыёзным фартыфікацыйным аб'ектам у гісторыі чалавецтва. Аднак, як аказалася, каб убачыць цуды, не трэба ездзіць далёка. Паводле энцыклапедыі, драўляны замак у Вінніцы (Украіна) займаў плошчу 3 тысячы км². Гэта ў паўтара раза больш за плошчу Мінскага раёна! На недагледзе рэдакцыі "грандыёзнае" фартыфікацыйнае збудаванне з'явілася таксама ў горадзе Астрог (Украіна). У кнізе адзначана, што мураваная вежа Луцкая брама, узведзеная ў першай палове XV ст., у плане мела памеры 132 х 8 м. Вельмі цікава, што для ўзвядзення вала Ніжняга замка ў Полацку (даўжыня — 600 м, вышыня — 10 м, шырыня падэшвы — да 30 м) нібыта спатрэбілася ўсяго 230 м³ грунту. Паспрабуйце ўявіць сабе маштаб аб'ектаў, пра якія ідзе размова!

Значны інтарэс уяўляе таксама храналогія некаторых падзей. Выяўляецца, што пад час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654 — 1667) Быхаў быў захоплены рускімі войскамі толькі ў 1567 годзе. На думку рэдакцыі, Мяшчанская слабада ў Маскве была заснавана ў верасні 1772 года, а знікла пасля пажару 1712 года.

■■■

Напрыканцы хочацца спыніцца на артыкуле "Сураж". Ён быў напісаны мной для энцыклапедыі "Вялікае княства Літоўскае" на падставе вынікаў уласных даследаванняў. Пры гэтым рэдактары, якія працавалі над кнігай, узгаднілі са мной (зрэшты, як і з іншымі аўтарамі) канчатковы варыянт артыкула. Рэдакцыя "Городов, местечек и замков" перадрукавала артыкул у перакладзе на рускую мову, не ўказаўшы мяне ў спісе аўтараў. Але справа нават не ў грубым парушэнні аўтарскіх правоў. Пры "перакладзе" па незразумелых прычынах дата пабудовы Суражскага замка была зменена з 1560 на 1563 год. У сваім артыкуле я грунтаваўся на інфармацыі прывілея Жыгімонта Аўгуста суражскім мяшчанам 1560 года. Дакумент адназначна сведчыць пра тое, што ў лістападзе 1560 года замак і мястэчка ўжо існавалі. Хочацца ведаць, якім чынам вызначылі дату заснавання Суража супрацоўнікі выдавецтва?

Энцыклапедыя павінна змяшчаць сістэматызаваныя праверэныя веды. На жаль, пра дадзенае выданне гэтага сказаць нельга. Праблемы перакладу, адсутнасць дакладных крытэрыяў падбору матэрыялу, шматлікія памылкі і супярэчнасці… Магчыма, віной усяму — празмерная паспешлівасць?

Максім МАКАРАЎ,
кандыдат гістарычных навык

Каментарый з нагоды

Спалучыць хуткасць з якасцю

Рэдакцыя "К" звярнулася па каментарый адносна самой энцыклапедыі і водгуку на яе да загадчыка аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдата гістарычных навык Аляксандра ГРУШЫ:

— На мой погляд, прычына з'яўлення на паліцах кнігарняў кнігі ў такім выглядзе — недастатковая праца саміх складальнікаў. Вядома, рыхтуючы такое выданне, трэба прыцягваць як мага большую колькасць спецыялістаў. І яны ў нас ёсць, аднак чамусьці далёка не ўсе аказаліся задзейнічаны ў працэсе падрыхтоўкі энцыклапедыі.

А другая прычына — спешка. Усім нам вядома, як складана спалучыць хуткасць і своечасовасць выканання з якасцю. Але ж выдадзеная кніга — гэта "Божы суд", і ўсе маюць магчымасць выказаць сваю думку пра яе. Энцыклапедыя стане здабыткам і многіх замежных навукоўцаў, якія таксама заўважаць пералічаныя "ляпы".

Дадам, што да энцыклапедый адносяцца як да "апошняга слова" ў навуцы. Імі карыстаюцца самыя шырокія колы грамадства. Ім даверяюць. Але ў выпадку з "Городами, местечками и замками Великого княжества Литовского" ёсць верагоднасць пераходу памылак і ў іншыя выданні, работы студэнтаў і вучняў і нават прафесійных даследчыкаў. Таму, паўтаруся, рыхтаваць энцыклапедычныя выданні трэба з асаблівай адказанасцю. Лічу, што водгук Максіма Макарава яшчэ раз гэта засведчыў.

Абмяркоўваючы Зводны план

У праекце "Зводнага плана ўстаноўкі манументальных збудаванняў у Рэспубліцы Беларусь у 2009 — 2012 гг.", апублікаваным у № 23 газеты "Культура" ёсць шэраг цікавых прапаноў, асабліва па Брэсцкай, Віцебскай і Гродзенскай абласцях. Але за аснову развіцця манументальнага мастацтва, на мой погляд, усё ж трэба ўзяць "Прапановы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі…", якія вызначаюцца абгрунтаванасцю, узважанасцю і сістэмнасцю. Лічу неабходным выказаць у сувязі з гэтым некалькі пажаданняў.

На прэстыжных месцах

Становішча Мінска як сталіцы абавязвае, каб на яго вуліцах і плошчах, у парках і скверах стаялі помнікі найбольш выдатным нацыянальным дзеячам у галінах культуры, навукі, палітыкі. І таму варта вітаць прапановы ўшанаваць тут памяць Усяслава Чарадзея, Станіслава Манюшкі, Кастуся Каліноўскага, Браніслава Эпімах-Шыпілы, Мітрафана Доўнара-Запольскага, Івана і Антона Луцкевічаў, Усевалада Ігнатоўскага, Зміцера Жылуновіча, Браніслава Тарашкевіча ды іншых асоб. Зразумела, што ў перспектыве ў Мінску мусяць паўстаць таксама помнікі каралю Міндоўгу, вялікім князям Вітаўту і Жыгімонту Старому, найвышэйшым гетманам Канстанціну Астрожскаму і Яну Каралю Хадкевічу, канцлерам Астафею Валовічу і Льву Сапегу, дзяржаўным дзеячам Тадэвушу Рэйтану і Вацлаву Ластоўскаму. Маштаб дзейнасці і веліч гэтых асоб, значэнне іх у айчыннай гісторыі заслугоўваюць таго, каб для помнікаў ім аддалі адны з самых прэстыжных месцаў у сталіцы нашай краіны.

Разам з тым, мы не павінны забывацца пра нашых славутых суайчыннікаў, якія нарадзіліся па-за абшарам, акрэсленым сучаснымі межамі Рэспублікі Беларусь, або чыё месца нараджэння дакладна не вядома. Сярод іх варта найперш назваць заснавальніка кнігадрукавання ў Расіі і Украіне Івана Федаровіча (Фёдарава), вынаходніка шматступеневай ракеты Казіміра Семяновіча, матэматыка, першую ў свеце жанчыну-прафесара Соф'ю Кавалеўскую (Карвін-Крукоўскую), вучоных-эвалюцыяністаў братоў Уладзіміра і Аляксандра Кавалеўскіх, даследчыка Цэнтральнай Азіі Мікалая Пржавальскага (Перавальскага), заснавальніка геліябіялогіі Аляксандра Чыжэўскага, мастака Казіміра Малевіча. Імёны іх вядомы далёка ў свеце, і годнае ўшанаванне іх памяці ўзніме статус нашай сталіцы як еўрапейскага культурнага цэнтра.

Істотныя дэмаграфічныя зрухі апошняга часу, знікненне шэрагу населеных пунктаў ствараюць пэўныя праблемы ў мемарыялізацыі памятных мясцін. Але, дбаючы пра развіццё правінцыйных асяродкаў, неабходна, па магчымасці, набліжаць устаноўку манументальных збудаванняў да месцаў, непасрэдна звязаных з жыццём і дзейнасцю славутых людзей. Думаецца, нерацыянальна ставіць помнік Аляксандру Ельскаму ў Мар'інай Горцы, тым часам як яго родная вёска Дудзічы ўваходзіць у кола турыстычных маршрутаў, а побач з ёю сфарміраваўся музейны комплекс "Дудуткі".

Будзем спадзявацца, што "Зводны план устаноўкі мемарыяльных збудаванняў" ажыццявіцца, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці сённяшняга часу. І праз чатыры гады мы ў такім выпадку будзем мець прынцыпова іншую сітуацыю з помнікамі і з мемарыяльнымі знакамі. Галоўнае, каб у гэтай справе не было паспешлівасці, каб праекты абмяркоўваліся з удзелам грамадскасці, каб помнікі і мемарыяльныя знакі рабіліся высокамастацкімі, выконваліся вядомымі скульптарамі з якасных і даўгавечных матэрыялаў.

Зміцер САНЬКО,
галоўны рэдактар кніжнай серыі "Нашы славутыя землякі"

НА СКРЫЖАВАННІ ШЛЯХОЎ

ГАЛАСОЎ. ТРЭКУ

Міжнародны конкурс маладых выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск-2009” завяршыўся. Перамаглі, як і на некалькіх ранейшых фестывалях “Славянскі базар у Віцебску”, беларусы. Гамяльчанін Дзмітрый Даніленка, які выступаў ад Расіі, дзе жыве, вучыцца і працуе, заваяваў Гран-пры. Яго зямляк, сябра і ў чымсьці “аднакласнік” Андрэй Коласаў (абодва вучыліся ў класе аднаго педагога — маці Андрэя) атрымаў Другую прэмію і Прыз імя У.Мулявіна. Конкурс упершыню трансліравалі замежныя тэлекампаніі, а не толькі Першы нацыянальны. Здавалася б, што яшчэ трэба? Роздум. Над поспехам і не толькі.

Конкурс, на маю думку, — заўсёды скрыжаванне. Ва ўсіх сэнсах гэтага слова. Гэта і крыжаванка: паспрабуй разгадай! І ўменне падлічваць “крыжыкі”: у каго болей плюсаў? І цяжкі крыж, які нясе кожны сольны выканаўца: без конкурсаў сёння ўсё цяжэй прабіцца і заявіць пра сябе. Гэта і скрыжаванне, вобразна кажучы, рыцарскіх шпаг, калі лепшага вылучае паядынак. Скрыжаванне сцежак, адна з якіх вядзе да перамогі. Нарэшце, жыццёвае скрыжаванне, бо пасля конкурсу ўдзельнікаў падсцерагаюць каго — слава, каго — расчараванне ці, наадварот, упартасць, прага да лідэрства.

А яшчэ любы конкурс — гэта скрыжаванне мастацтваў: трэба ж не толькі мець адпаведны ўзровень, але і ўмець яго прадэманстраваць. Няма чаго і казаць, што на “Славянскім базары ў Віцебску” неабходнасць скрыжавання мастацтваў становіцца яшчэ больш відавочнай.

Намалюйце нам турнір!

Музычны конкурс як відовішча — такая канцэпцыя творчага спаборніцтва пачала развівацца ў нас зусім нядаўна. Але ж чым, як не шоу, разлічаным на ўдзячную публіку, можна назваць і старажытнагрэчаскія алімпіяды, і рыцарскія турніры, і многія цяперашнія конкурсныя тэлепраекты?

Набыў відовішчнасць і конкурс “Славянскага базару ў Віцебску” — дарэчы, следам за дзіцячым, бо там выступленні юных артыстаў традыцыйна падтрымліваліся падтанцоўкамі харэаграфічнага ансамбля “Зорька” Гарадскога цэнтра культуры “Віцебск”, аздабляліся скразной тэмай, пазначанай у сцэнаграфіі.

Сёлетні конкурс сапраўды было цікава не толькі слухаць, але і глядзець, так што публіка (асабліва ля тэлеэкранаў) ад такога новаўвядзення толькі выйграла. Праўда, часам “карцінка” пачынала прэтэндаваць на куды больш значную ролю выходзячы на першы план і адцягваючы ўвагу ад канкурсанта і яго песні.

Упершыню канцэртам-прэзентацыяй стала і лёсаванне, гэтым разам — адкрытае для публікі (наяго, дарэчы, таксама прадавалі білеты). Па-абапал авансцэны Віцебскай абласной філармоніі былі выстаўлены малюнкі віцебскай дзятвы, іх аўтары займалі першы рад партэра. Кожны з маладых салістаў, праспяваўшы пазаконкурснуюкампазіцыюпа ўласным жаданні, выбіраў кагосьці з юных мастакоў. Той, у сваю чаргу, паказваў сваю карціну, на адваротным баку якой і хаваўся парадкавы нумар чарговага конкурснага выступлення. Малюнкі потым раз’ехаліся па краінах-удзельніцах, але пад час усяго лёсавання яны заставаліся перад вачыма гледачоў — быццам “кліпы”, “рэжысіраваць” якія публіка магла самастойна. А які “піар” дзятве! Ці часта на якой-небудзь выстаўцы мы можам правесці перад аднымі і тымі ж карцінамі дзве гадзіны запар? А тут — калі ласка. І, як вынік, запомніліся абсалютна ўсе малюнкі.

Запомніліся, на жаль, і не зусім удалыя строі, сцэнічныя паводзіны ды, шырэй, іміджы некаторых канкурсантаў. Гэта праблема паўстае на “Славянскім базары ў Віцебску” штогод. Старшыня журы Лайма Вайкуле мела рацыю, калі прапанавала далучаць да конкурсных праграм спецыялістаў, якія дапамагалі б канкурсантам “знайсці сябе” ў выбранай песні: не толькі далучалі б да іх “знешні антураж”, але і “кіравалі” іх уласнымі сцэнічнымі рухамі, адпаведным знешнім выглядам.

Слабы і моцны полы

Сёлетні конкурс атрымаўся пераважна мужчынскім: на 12 хлопцаў — 4 дзяўчыны. Лайма Вайкуле пракаменціравала гэта з пазіцый публікі: маўляў, дрэнна, што будзе мала прыгожых сукенак (Вось вам, дарэчы, яшчэ адзін доказ на карысць неабходнага павышэння відовішчнасці конкурсу за кошт танцавальных і цыркавых нумароў “суправаджэння”!).

Расклад дзіцячага спаборніцтва застаўся пры гэтым звычайным: на 16 дзяўчынак — усяго 3 хлопчыкі. Для дзятвы гэта нармальна. Усе дзяўчынкі, як вядома, мараць стаць артысткамі, яны больш паслухмяныя, уседлівыя. Хлопчыкаў жа прывучыць да рэгулярных заняткаў было больш складана. А з дарослымі — скажаце, выпадковасць? Можа, і так. Але рэзкія змены такога кшталту ў тым ці іншым кірунку дзейнасці маюць яшчэ і сацыяльны аспект.

Рэзкі прыток мужчын у нейкую прафесію сведчыць пра павышэнне яе сацыяльнага статуса, прэстыжу, — і наадварот. Так што цяперашні конкурс — адна з “першых ластавак” таго, што музычныя спецыяльнасці, нягледзячы на крызіс, пачынаюць усё больш ацэньвацца не толькі ў апладысментавым, але і грашовым эквіваленце: публіка былых сацыялістычных рэспублік і дзяржаў не толькі пачынае ўсведамляць, што за мастацтва і майстэрства артыстаў трэба плаціць, але і пагаджаецца гэта рабіць, “галасуючы” грашыма.

Прайсці па этапах

Сёлета ў конкурсе знік паўфінал: прэтэндэнтамі на ўзнагароды выступалі ўсе адабраныя арганізатарамі канкурсанты (праўда, адразу ў меншай колькасці, прыдатнай для тэлетрансляцый). Але “этапаў” і, адпаведна, конкурсных дзён засталося, як і раней, тры. І хаця спевы канкурсантаў пад час лёсавання не ацэньваліся баламі, журы і ўсе ахвотныя мелі магчымасць зрабіць свой выбар, хай і не канчатковы. Па словах Л.Вайкуле, гэта вельмі дапамагло журы. Паводле традыцыі, балы, выстаўленыя кожным з членаў журы на конкурсных праслухоўваннях у Летнім амфітэатры, адразу з’яўляюцца на электронным табло. Таму вельмі добра, што, перш чым імгненна выносіць свой вердыкт кожнаму спеваку, журы змагло зарыентавацца і ў вакальных магчымасцях удзельнікаў, і ва ўзроўні іх падрыхтоўкі, і, галоўнае, у агульным конкурсным раскладзе: “У канкурсантах мы звычайна шукаем унутраны стрыжань, ацэньваем перспектыву. Спевака бачна ўжо праз хвіліну — нават па тым, як ён трымаецца на сцэне, даносіць змест песні”.

Дый для самих спевакоў дадатковае выступленне было не залішнім. Паказальна, што балы, выстаўленыя ў апошні конкурсны дзень, калі удзельнікі спявалі з Нацыянальным канцэртным аркестрам Беларусі пад кіраўніцтвам маэстра Міхаіла Фінберга, амаль ва ўсіх былі традыцыйна вышэйшымі. І гэта зразумела, бо сказваюцца і плённыя аркестравыя рэпетыцыі, што пачынаюцца ў Мінску за некалькі дзён да віцебскай вандроўкі, і “прывыканне” да новай сцэны Летняга амфітэатра.

Але ўжо пасля першага знаёмства з канкурсантамі ўражанні той жа Л.Вайкуле былі добрымі. Таму яна выказала думку, што спевакам, мабыць, было б псіхалагічна лягчэй выходзіць у розныя конкурсныя дні пад рознымі нумарамі. Але і заўважыла, што ўдзельнікам, незалежна ад парадкавага нумара, трэба дбаць пра добрую конкурсную песню. Па-першае, тая павінна выйгрышна паказваць галасавыя даныя. Па-другое, канкурсантам не трэба забывацца на слухача: наўрад ці Аляксандр Рыбак перамог бы на “Еўрабачанні”, каб не трапны выбар песні. А кампазітар і спявак Крыс Цёрнер, які прадстаўляў у журы Велікабрытанію, адзначыў уласнымі прызамі канкурсантаў, што выступілі са сваімі аўтарскімі песнямі.

Майстры і “...-класнікі”

Павышэнне прафесійнай планкі конкурсу ў пэўнай ступені звязана і з больш сталым узростам удзельнікаў: паводле конкурсных умоў — ад 17-ці да 35-ці, паводле сёлетняга складу канкурсантаў — ад 19-ці да 33-х. Што ні кажыце, а ў такім узросце нават эстрадныя музыканты ўжо канчаткова вызначаюцца з прафесіяй, атрымліваюць адукацыю, маюць магчымасць асэнсавана ўдасканальваць сваё майстэрства. У тым ліку, на самім “Славянскім базары ў Віцебску”.

І хаця на нашым фестывалі не практыкуюцца майстар-класы, шмат цікавага даюць выступленні членаў журы і былых пераможцаў конкурсу. Не менш сімвалічна, што завяршаюць конкурсную праграму, паводле традыцыі, выступленні членаў журы. Таму была магчымасць пераканацца, што роўных Лайме Вайкуле — няма.

Сярод канкурсантаў-майстроў (хаця некаторым з іх, можа, не зусім пашанцавала) адзначу ўладальнікаў III прэміі — Іеронімаса Мілюса (Літва) і Пятра Дзмітрычэнку (Украіна), вельмі стыльнага Збінэка Дрду (Чэхія), уладальніка I прэміі Пашу Парфенія (Малдова), які скарыў новым прачытаннем “Свечкі” з рэпертуару Алы Пугачовай. А вось нашага Андрэя Коласава (II прэмія і Прыз імя У.Мулявіна), пры ўсёй мяккасці яго барытона і конкурсных выступленнях “па ўзыходзячай”, яшчэ чакае працяглая і ўпартая праца: і над вакальнымі тонкасцямі, і над сцэнічнымі вобразамі, дзе вельмі важна бывае “пражываць” не толькі куплет і прыпеў, але і інструментальныя пройгрышы, і над рэпертуарам.

Няпросты пошук уласнага “Я” накананаваны і ўладальніку Гран-пры Дзіму Даніленку (Расія) — пакуль што, па меркаванні фестывальнай прэсы, гэткаму “Мікалаю Баскаву-2”. На ўсе пытанні журналістаў наконт гэтага знешняга, вакальнага і рэпертуарнага падабенства Дзіма неаднаразова падкрэсліваў: маўляў, такое параўнанне можа мне толькі “льстить”. Хай сабе і так, але ж ці ў гэтым прызначэнне творцы — быць чыімсьці “клонам”? Гэта, хутчэй, псіхалогія пачаткоўцы: быць ва ўсім падобным да куміра. А яшчэ — закон шоу-бізнесу: чаму б не тыражаваць тое, што карыстаецца попытам?

Вольнае плаванне

Пераможцамі можна лічыць усіх канкурсантаў: хто не стаў лаўрэатам — стаў дыпламантам Міжнароднага конкурсу, што, паверце, таксама вельмі і вельмі прэстыжна. А дзякуючы шматлікім спонсарам, практычна ўсе ўдзельнікі атрымалі спецыяльныя ўзнагароды і разнастайныя прызы. Цікавай уяўляецца і прапанова Райманда Паулса: арганізаваць на адным з наступных фестываляў сумесны канцэрт пераможцаў розных гадоў “Славянскага базару ў Віцебску” і “Новай хвалі”.

Але ж сэнс конкурсу — зусім не толькі ў перамозе і далейшай “раскрутцы”. Ёсць так званы “сіндром студэнта”: паступіўшы ў ВНУ, былы выдатнік раптам страчвае прагу да вучобы і паступова скатваецца па нахільнай. Псіхолагі сцвярджаюць, што так адбываецца, калі абітурыент ставіць перад сабой толькі адну мэту — паступіць, а дасягнуўшы яе, не ставіць новых, больш высокіх. Так і з конкурсам: дасягнуўшы мэты — перамагчы — трэба ставіць ды ставіць новыя. І так — усё жыццё. Як справядліва сказала Л.Вайкуле, “журы не вырашае лёс канкурсантаў. Мы даём ім хіба маленькі шанц”. Той шанц — прага шукаць самастойны творчы шлях. А калі і збочваць на пратаптаную сцяжынку, дык для таго, каб выйсці на гасцінец поспеху.

Каля Алеі лаўрэатаў спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пасля вячэрняга канцэрта.

Ад прывітання да развітання

Адгучалі апошнія акорды XVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", апошнія выбухі святочных феерверкаў. Для цэласнага асэнсавання фестывалю спатрэбіцца некаторы час, але ўжо сёння можна адзначыць найбольш знакавыя падзеі цяперашняга форуму.

33 краіны, 5,5 тысяч удзельнікаў, 600 прадстаўнікоў СМІ з 11 краін свету, каля 80 мерапрыемстваў, 21 з іх — у Летнім амфітэатры. За гэтай сціслай статыстыкай — цэлае мора эмоцый, адкрыццяў, сустрэч. А над усім — гучанне віцебскіх званоў. Пры ўсіх мірскіх клопатах і дбанні аб павышэнні грашовых фестывальных прыбыткаў (а сёлета фестываль дасягнуў планкі ў 60 працэнтаў самаакупнасці) горад мэтанакіравана адраджае сваю багатую шматканфесійную духоўную ауру.



На гала-канцэрце Дня Беларусі.

Нашы сола і tutti

На гала-канцэрце майстроў мастацтваў Беларусі, які прыпадаў сёлета на перадапошні фестывальны дзень, быў аншлаг. Ды яшчэ які! Калі ў мінулыя гады, здаралася, заставалася багата вольных месцаў і на іх пускалі без білетаў, дык сёлета апошнія былі літаральна "размецены" ўжо ў першыя дні продажу. У гэтым сэнсе з канцэртам Дня Беларусі магло канкурыраваць хіба ўрачыстае адкрыццё фестывалю, якое традыцыйна выклікае павышаны ажыятаж. Такі небывалы попыт на нашых артыстаў з боку фестывальнай публікі, якая, здавалася б, магла і стаміцца за святочны тыдзень, адзначыў на прэс-канферэнцыі майстроў мастацтваў Беларусі першы намеснік міністра культуры нашай краіны Уладзімір Рылатка.

Гасцей сустракае "Горад майстроў".

Сапраўды, тыя, хто не трапіў на канцэрт ці не змог паглядзець тэлетрансляцыю, шмат чаго страцілі. Імпульс канцэрту надала прамова міністра культуры Беларусі Паўла Латушкі — не толькі змястоўная, але і надзвычай паэтычная. Далейшыя тры гадзіны праляцелі, бы на адным дыханні. Адметнасцю канцэрта сталі не толькі элементы тэатралізацыі (іх, дарэчы, можна было б і пашырыць, каб дазваляў час), не толькі ўдзел знакамітасцей, сярод якіх былі і расійскія госці, але і — галоўнае — адкрыццё для шырокай публікі новых маладых артыстаў і творчых калектываў з абласцей, а таксама падкрэсліванне новых рыс нашых самых "брэндавых" зорак. Канцэрт можна было параўнаць з магутным аркестравым гучаннем, у якім, пры ўсёй яго збалансаванасці і роўнасці, праслухоўваўся кожны голас, не губляліся асобныя тэмбры.

Далучыце да гэтага моцнага tutti сольнікі Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны, прафесара Міхаіла Фінберга, Прэзідэнцкага аркестра на чале з Віктарам Бабарыкіным, Дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага калектыву "Харошкі", шырокі ўдзел нашых артыстаў у многіх фестывальных праграмах, паспяховыя конкурсныя выступленні. Усё гэта разам і склала беларускі нацыянальны арнамент, яркімі фарбамі ўпісаны ў агульнае фестывальнае палатно.

Праз песні — да міру

Пятым уладальнікам спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення" стаў народны артыст Расіі Валерый Лявонцьеў. Уручэнне гэтага прыза, паводле традыцыі, адбылося на ўрачыстым адкрыцці фестывалю.

— Паважаны Аляксандр Рыгоравіч, дарагія сябры! — усхвалявана сказаў В.Лявонцьеў, атрымаўшы ўзнагароду з рук Кіраўніка нашай дзяржавы. — Вялікі дзякуй вам за вашу ўвагу да маёй больш чым сціплай персоны. Аднойчы ўзнікнуўшы, "Славянскі базар у Віцебску" ператварыўся ў традыцыю, а традыцыя стала святам. Нас з вамі яднае яркае і дэмакратычнае мастацтва — песні. Дык няхай песні гучаць і дапамагаюць нам жыць! Вялікі вам дзякуй, сябры!

Апошнія словы сваёй сціслай прамовы знакаміты спявак вымавіў па-беларуску, і гэта кранула асабліва. Зрэшты, сёння літаральна кожная зорка, прыязджаючы да нас, імкнецца далучыцца да нашай нацыянальнай культуры: праз беларускія прысмакі, выкананне нашых твораў, беларускую мову. Такому збліжэнню народаў і служыць наш фестываль, дэвіз якога: "Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення". А галоўнай узнагародай фестывалю становяцца нават не конкурсныя прызы, а выбітная статуэтка, дарагая для кожнага з яе ўладальнікаў яшчэ і тым, што яна атрымана з рук Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі.

Зоркі-кветачкі-агеньчыкі

Алея лаўрэатаў спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення", што была адкрыта 10 ліпеня, адразу стала ўлюбёным куточкам фестывальнага Віцебска. Сюды наведваюцца не толькі тыя, хто прыходзіць на канцэрты ў Летні амфітэатр, — завітваюць і "проста так": пасобку, сем'ямі, кампаніямі. А ўжо які натоўп сабраўся тут у час яе адкрыцця, і апісаць немагчыма! Ва ўрачыстай цырымоніі ўдзельнічалі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка, старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец і народны артыст Расіі Валерый Лявонцьеў.

Знакаміты спявак пажартаваў: маўляў, прыемна, калі цябе "закатваюць" у асфальт. На справе ж, Валерый Лявонцьеў даўно ўжо "замураваны" ў сэрцах і прызнанні народа — як і тыя творцы, якія былі адзначаны гэтай высокай узнагародай Кіраўніка нашай краіны раней.

Яшчэ больш прывабна і ў чымсьці нават таямніча выглядае Алея ўвечары, калі запальваюцца зоркі-кветачкі-агеньчыкі. Імі, бы вясновым квеценем, аблеплены штучныя дрэвы. Ды ўсё ж асабліве адчуванне цяпла і радасці зыходзіць не ад іх, а ад саміх зорных імёнаў, упісаных залатымі літарамі нават не ў граніт, а ў нашыя сэрцы.

"Зорныя гадзіны" на "Славянскім базары ў Віцебску" дораць артыстам магчымасць пагутарыць адразу з усёй акрэдытаванай на фестываль прэсай, а журналістам — убачыць "зорак", так бы мовіць, на "камернай сцэне". Бо іх прэс-канферэнцыі — гэта часта тыя ж сцэнічныя выступленні, толькі крыху ў іншым жанры.

Дарэчы, ураджэнцаў нашай краіны сярод іх аказалася нямала. Для некаторыя з гасцей "Славянскага базару ў Віцебску" прыязджаць да нас як дадому ўвайшло ў традыцыю, а іншыя, падобна на тое, такое правіла толькі назапашваюць.

Той жа пераможца "Еўрабачання" Аляксандр РЫБАК "журыў" на тэлепраекце "Новыя галасы Беларусі". Тым не менш, яго першымі словамі на віцебскай "Зорнай гадзіне" зноў стала падзяка за падтрымку, якая і прынесла яму перамогу: "Дзякуй, што "хварэлі" за мяне і галасавалі, — дзякуй за 12 балаў ад Беларусі".

Аляксандр РЫБАК (Нарвегія):

"Дзякуй за 12 балаў!"

Ён шчыра радаваўся, што сустрэў тут сяброў. Расказваў, якой шчаслівай была яго маці, даведаўшыся пра запрашэнне на гэты фестываль, бо "Славянскі базар у Віцебску" — адзін з найбольш прэстыжных форумаў. Шкадаваў, што давялося прыехаць толькі на адзін дзень, дый тое няпоўны, ледзь "выкраены" са шчыльнага графіка гастролей: 9 ліпеня ў яго быў канцэрт у Нарвегіі, 10-га — самалётам да Віцебска, а пасля канцэрта — назад.

Нават са сваёй віцебскай бабуляй сустрэцца не паспеў: "Мне сказалі: напішы ёй паштоўку. Я так узрадаваўся: не ведаў, што яна ўмее чытаць SMS". Пасля гэтых слоў, вядома, "узрадаваліся" журналісты, а Саша не мог зразумець, што ж такое смешнае ён сказаў. Не разабраўся ён пакуль і ў іншых нашых звычках, блытаючы ў зваротах да акул пяра "ты" і "вы": "Я ведаю, што ў вас да шаноўных людзей трэба звяртацца на "вы". Але ніяк не ўцямлю, каго трэба шанаваць, а каго — не вельмі".

Вось яны, асаблівасці нацыянальных традыцый! Але сваім музычным выхаваннем ён абавязаны менавіта нашай выканальніцкай школе, заснаванай на трывалых традыцыях — у прыватнасці, раннім далучэнні адораных дзяцей да рэгулярных штодзённых заняткаў: "Маці мне гаварыла, што так робяць усе дзеці тут, і я займаўся па дзве-тры гадзіны на дзень, хоць аднагодкі, здаралася, і смяяліся з мяне".

Зараз па столькі ж, а то і болей часу ў яго прыпадае на раздачу аўтографаў. Пасля аднаго з канцэртаў гэтая прыемная для Сашы працэдура доўжылася, па яго словах, чатыры гадзіны: "Мне падабаецца сустракацца з публікай, таму я стаў артыстам, а не кампазітарам ці рэжысёрам". З-за напружанага гастрольнага графіка давялося нават адкласці атрыманне кансерваторскага дыплома. Аднак працай сваёй ён задаволены: "Мне плацяць грошы за тое, за што некалькі гадоў таму я сам збіраўся плаціць, каб толькі гэтым займацца". Дый ад кампазітарскай прафесіі не адмаўляецца — наадварот, думае плаўна "змадуляваць" да яе праз нейкі час. І не толькі таму, што даўно піша ўласныя песні, з ліку якіх і яго пераможная "Казка": "Праз чатырыпяць гадоў я ўжо не буду "ідалам" для маленькіх дзяўчынак. Дый вельмі цяжка мець жонку і ездзіць на гастролі. Тады я стану кампазітарам і буду пісаць музыку да фільмаў".

Дый на сваёй радзіме ён збіраецца быць часцей: "Самае галоўнае — праз год-два я прыеду сюды проста адпачыць, а не дзеля таго, каб людзі за мной бегалі".

Фестываль + ноўтбук...



Са сваіх беларускіх сувязей пачаў размову на "Зорнай гадзіне" знакаміты паэт-"шасцідзесятнік" Яўген ЕЎТУШЭНКА.

Узгадваў, як ягоная сваячка, якая ў вайну была партызанскай сувязной, паказвала яму апёкі на грудзях ад фашысцкіх зажыгалак, дадаючы: "Я нікога не выдала!". І як ён чытаў вершы на перонах, калі маці, ад'язджаючы на фронт, адправіла яго да бабуль.

На думку, паэта, літаратура — гэта, найперш, педагогіка. На яго творчым вечары "Раман з жыццём" у Канцэртнай зале "Віцебск" лейтматывам гучалі словы: "Вы адвыклі ад паэзіі". Стаўшы першым такім госцем-пісьменнікам за 18-гадовую гісторыю фестывалю, адну са сваіх місій на "Славянскім базары ў Віцебску" Я.Еўтушэнка бачыць у тым, каб давесці пра неабходнасць і надалей развіваць на гэтым святе мастацтваў літаратурную частку, запрашаючы да ўдзелу паэтаў, празаікаў, журналістаў, што выдалі свае кнігі.

Еўтушэнка адгукнуўся на прапанову Райманда Паулса, зробленую яму яшчэ напярэдадні віцебскага форуму, напісаць некалькі песенных вершаў. Сустрэча творцаў адбылася акурат на святе мастацтваў, і, быццам дэманструючы яшчэ адно яднанне муз, Яўген Аляксандравіч плённа сумяшчаў "фестываленне" з непасрэднай творчай працай. Паэта ў атачэнні ўсёй яго сям'і (жонкі і двух сыноў) можна было бачыць у прэс-цэнтры, дзе ён, адным вокам пазіраючы на экран з конкурснай трансляцыяй, з галавой сыходзіў у свой ноўтбук.

Яшчэ адну сваю місію Я.Еўтушэнка бачыць у тым, каб увесці ва ўсе ВНУ, нават тэхнічнага профілю, пасады "пісьменніка пры універсітэце". Той павінен дбаць не толькі пра арганізацыю і вядзенне літаратурнага гуртка: праз далучэнне да добрай літаратуры ў моладзі будуць выхоўвацца адпаведныя эстэтычныя густы, мысленне, уменне аналізаваць жыццёвыя сітуацыі.

Матэрыялы развароту падрыхтавала Надзея БУНЦЭВІЧ, наш спецыяльны карэспандэнт у Віцебску
Фота аўтара і з сайта фестывалю

Шыкоўны падарунак Віцебску

Дырэктар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Глеб Савіцкі, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Сяргей Нарышкін, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей, міністр культуры нашай краіны Павел Латушка ў час цырымоніі перадачы.

Першая знакавая падзея "Славянскага базару" адбылася ў мастацкім музеі фестывальнага горада: Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД падарыў Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею, філіялам якога з'яўляецца мастацкі, лічбавыя копіі шасці карцін Іллі Рэпіна, арыгіналы якіх знаходзяцца ў Траццякоўскай галерэі ў Маскве і Рускім музеі ў Санкт-Пецярбургу.

Ва ўрачыстай цырымоніі ўдзельнічалі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Сяргей Нарышкін, які выступіў галоўным ініцыятарам і арганізатарам праекта, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей і міністр культуры нашай краіны Павел Латушка. Гэты падарунак быў прымеркаваны не толькі да славянскага форуму: 5 жніўня спаўняецца 165 гадоў з дня нараджэння знакамітага мастака, жыццё і творчасць якога былі звязаны не толькі з Расіяй, але і з Беларуссю ды Украінай. Непадалёк ад Віцебска знаходзіцца Музей-сядзіба І.Рэпіна "Здраўнёва": у гэтых мясцінах у 1892 — 1902 гг. ён стварыў больш за 60 карцін і малюнкаў.

— Год таму ў час правядзення фестывалю, — паведаміў Сяргей НарышкІн, — нам пашчасціла пабываць у Здраўнёве, дзе вялікі мастак чэрпаў натхненне. І мы вырашылі зрабіць такі падарунак: узяць на сябе абавязак падарыць копіі некалькіх работ Рэпіна, напісаных тут.

— Нішто не можа разарваць, — дадаў Уладзімір Макей, — нашы братэрскія сувязі. Гэты падарунак — чарговы важкі ўнёсак у развіццё агульнай культурнай прасторы.

Уважліва разглядаю карціны "На сонцы (Т.І. Рэпіна)", "У хаце", "Восеньскі букет", "Дуэль", малюнкі "У полі", "Паненка ў вёсцы". Лічбавыя копіі маюць такую добрую якасць, што адрозніць іх ад арыгіналаў змогуць хіба спецыялісты, — тым больш, што і выкананы яны на палотнах алеем. Звяртаюся па каментарый да загадчыка мастацкага музея Вольгі Акуневіч.

— Гэта вельмі значная для нас акцыя, — распавяла Вольга Іванаўна. — У нашых фондах ёсць 14 рэпінскіх арыгіналаў. Пераважна гэта малюнкі, выкананыя на паперы ці кардоне алоўкам і акварэллю, 8 з якіх у 1935 годзе падарыла дачка Іллі Рэпіна Таццяна. Два абразы, напісаныя Рэпіным алеем на цынку — "Божая Маці з немаўляткам" ("Богоматерь с младенцем") і "Хрыстос з чашай" ("Христос с чашей"), — прыйшлі са Слабодскай царквы. Для яе ў свой час мастак іх напісаў. Але выстаўляць рэпінскія арыгіналы ў Музеі-сядзібе "Здраўнёва" небяспечна: там немагчыма стварыць неабходны тэмпературна-вільгасны рэжым, трэба ўлічваць і аддаленасць ад горада. Як жа тады знаёміць наведвальнікаў непасрэдна з творчасцю мастака яго здраўнёўскага перыяду? Выйсце было адно: копіі добрай якасці. Зараз існуюць найноўшыя тэхналогіі, якія дазваляюць гэта зрабіць. Але ж і каштуюць яны нятанна! Дый музеі звычайна насыроджана ставяцца да таго, што такія копіі з'явяцца яшчэ ў кагосьці. Таму мы вельмі ўдзячныя ўсім, хто спрычыніўся да дадзенай акцыі. Найперш — кіраўніцтву Траццякоўскай галерэі і Рускага музея, што яны пагадзіліся прадаставіць свае карціны для капіравання, і, вядома, Міждзяржаўнаму фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД, паколькі ён вылучыў неабходныя сродкі і падарыў копіі нам. Так што ў хуткім часе, калі завершыцца выстаўка работ Іллі Рэпіна ў нашым музеі, падораныя карціны змогуць убачыць і наведвальнікі "Здраўнёва". Дадам, што апошнім часам умацоўваецца і наша супрацоўніцтва з Рускім музеем у Санкт-Пецярбургу. Там будзе ладзіцца выстаўка твораў Давіда Якерсона, і нас запрасілі да ўдзелу, бо ў нашых фондах захоўваецца шмат яго работ, падораных жонкай мастака. Спадзяёмся, праз нейкі час і ў нас будуць выстаўлены творы вучняў Казіміра Малевіча — Веры Ермалаевай і Мікалая Суэціна, што знаходзяцца ў Рускім музеі.

Дарэчы, запланаваны ў Віцебску і майстар-класы маладых мастакоў краін СНД. Адпаведна, будзе арганізавана выстаўка іх работ. Няма сумнення, што гэтыя і многія іншыя сумесныя праекты ўзбагачаюць нашу культурную прастору.

Надзея БУНЦЭВІЧ,
наш спецкарэспандэнт у Віцебску
Фота Віктара ТАЛОЧКІ, БелТА

Скульптура і карункі

У наш час разнастайнасць можна заўважыць не толькі ў форме выражэння зместу, але і ў форме арганізацыі выстаўкі. Побач з традыцыйнымі калектыўнымі і аўтарскімі выстаўкамі ўсё часцей у сталічных музеях сустракаюцца дыялагічныя экспазіцыі. Больш за ўсіх да такой формы звяртаюцца ў Музеі гісторыі беларускага кіно. Варта ўспомніць хаця б выстаўку работ маладых мастакоў Ігара Клуйшы і Ігара Назарэнкі "З вокі" ці сумесную выстаўку Віктара Ціханава і Сяргея Шылы "ПроУдовольствие". Уступаючы ў дыялог, мастакі прадстаўляюць два розныя погляды на адну праблему, розныя спосабы вырашэння пэўнай задачы, ствараючы тым самым своеасаблівую палеміку. У той жа час, творы двух мастакоў могуць прадстаўляць думкі аднаго кшталту, але з розным падыходам да формы выражэння, выкарыстаннем розных відаў выяўленчага мастацтва.

А.Верашчагін. "Казка".

Цікавай, у тым ліку і з гэтага пункта гледжання, з'яўляецца выстаўка работ жывапісца Аляксандра Верашчагіна і скульптара Анатоля Сярчэні, якая гэтымі днямі праходзіць у выставачнай зале таго ж Музея гісторыі беларускага кіно.

Што аб'ядноўвае мастакоў? Перш за ўсё — дзевяцігадовае сяброўства. Па-другое, што заўважылася асабіста мне, — творчасць ні аднаго з іх не ўпісваецца пэўным чынам у агульнапрынятыя межы. Так, калі пры стандартным успрыняцці, скульптура асацыіруецца з манументальнымі, адлітымі з бронзы ці, у крайнім выпадку, высечанымі з каменю, фігурамі, то А.Сярчэня працуе пераважна з дрэвам і пры стварэнні скульптурных аб'ектаў прынцыпова карыстаецца сякерай. У сваю чаргу, жывапісныя творы А.Верашчагіна назваць палотнамі ў прамым значэнні гэтага паняцця ўвогуле не магчыма: мастак выкарыстоўвае кардон, неачэсаную драўніну, тканіны з карункавымі ўстаўкамі і нават кавалкі дываноў. Ад алею, які нібыта з'яўляецца прыкметай жывапісца, мастак адмовіўся яшчэ на другім курсе навучання. Зараз піша акрылам і тэмперай.

Складана ўявіць сабе, што ўкладае аўтар у свае творы, які змест хаваецца за гэтымі мудрагелістымі формамі, за багаццем фарбаў, за тэхнікай сакавітых, густых мазкоў. Але творца не мае на мэце раскрыць сябе гледачу. "Галоўнае — заставацца сабой, — кажа жывапісец, — а спадабаецца гэта аўдыторыі ці не, — справа другарадная. А яшчэ вельмі важна — захапляцца самім працэсам стварэння карціны. Так, калі пішу карціны, некаторыя дэталі ўзнікаюць проста пад час працы, адны элементы патрабуюць іншых. Аб іх раней, падаецца, і не думаў".

Па словах Аляксандра Верашчагіна, экспануюцца тыя творы, якія ўдалося сабраць. Таму яны не абмежаваны ні часавымі, ні тэматычнымі рамкамі. Так, некаторым палотнам ужо "за 20", іншыя ж мастак завяршаў літаральна ў дзень адкрыцця выстаўкі. Складана вызначыць і стыль жывапісца: ягоную творчасць і з гэтага пункта гледжання складана абмежаваць нейкімі рамкамі.

Наколькі супярэчлівыя ці, наадварот, блізкія адзін аднаму погляды мастакоў на творчасць і жыццё ў цэлым, вызначыць даволі складана. Відаць, кожны ўбачыць гэта сам і па-свойму.

А.Сярчэня. "Якім".

Дар'я ДАНІЛЕВІЧ

Зіма пасярэдзіне лета

У.Гераўкер. "Шлях".

У.Гераўкер. "Стары храм".

Выстаўка "Зімовыя сюжэты", якая адкрылася ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Л.Д. Шчамялёва, прадстаўляе серыю акварэльных пейзажаў мінскага мастака Уладзіміра Гераўкера.

Некаму можа падацца дзіўным, што тэмай летняй выстаўкі пейзажнага жывапісу сталася зіма "з яе халоднаю красою". Філасофская і паэтычная традыцыя разглядаць сезоны года і іх змену як метафару этапаў чалавечага жыцця напаўняе пейзажны жывапіс больш глыбокім сэнсам, чым мудрагелістая сюжэтнасць шматфігурных палотнаў. Вытокі канцэпцыі і ключ да яе інтэрпрэтацыі трэба шукаць у класіцы. У сваёй маленькай трагедыі "Каменны госць" Пушкін выявіў пазіцыю бесклапотнага юнацтва: калі "недвижим теплый воздух — ночь лимоном и лавром пахнет", Лауры ж няма справы да таго, што "...далеко на севере — в Париже — быть может, небо тучами покрыто, холодный дождь идет и ветер дует". Але змрочны Дон Карлас думае летам пра зіму, у разгар жарсцяў — пра холад белай цішыні. 16 зімовых сюжэтаў Уладзіміра Гераўкера — 16 намаганняў узятага ў палон Снежнай каралевай хлопчыка Кая зноў і зноў скласці з ільдзінак слова "вечнасць".

Акварэлі Гераўкера быццам бы звычайныя, стрыманыя (часам і проста "па-донкарласаўску" змрочныя), лаканічныя ў кампазіцыйных, танальных і колеравых рашэннях, тэхнічных прыёмах. Падкрэсленае пазбяганне "спецэфектаў" адпавядае "зімоваму" філасофскаму настрою: смешна і ганебна мітусіцца і пазіраваць перад велічным тварам памерлай ці паміраючай (аўтар часта ловіць пераходныя станы, паміж восенню і зімой) прыроды. Аўтарская пазіцыя мастака суадносіцца з блізкім класічнай школе разуменнем пейзажа, якое ідзе ў расійскім жывапісе ад Левітана ці, у некаторых момантах, — ад работ Віталя Цвіркі.

Уладзімір Гераўкер, выхаванец БДТМІ, піша акварэллю практычна ўсё свядомае жыццё. Як і ў большасці акварэлістаў, ягоны раман з вадзянымі фарбамі — занятак, як кажуць, для душы. Такі статус для акварэлі традыцыйны, нават у самых "акварэльных" краінах, скажам, у Велікабрытаніі, дзе гэтая тэхніка — як правіла, арыстакратычнае хобі, якое мае на ўвазе паралельны і сур'ёзны асноўны занятак.

Член Беларускай акадэміі архітэктуры, член Беларускага саюза дызайнераў, Уладзімір Гераўкер — уладальнік мноства прэстыжных узнагарод у галіне праектавання мэблі, а таксама дзесяткаў аўтарскіх патэнтаў у сферы дызайну. Аматарам вытанчаных мастацтваў і не менш вытанчаных вольных часін гэтая выстаўка адкрывае мастака з іншага, больш інтымнага, боку, у адпаведнасці з характарам і традыцыямі цудоўнага матэрыялу — акварэлі, працягваючы такім чынам адно з пастаянных тэматычных накірункаў галерэі.

Таццяна БЕМБЕЛЬ,
дырэктар Гарадской мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва

Як Несцерка "стаў" Купалам

11 ліпеня сваё шасцідзесяцігоддзе адзначыў Пятро Ламан — акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Сам ён з пэўнай доляй іроніі распавядае, што шлях гэты абраў пасля таго, як даведаўся, што "яго аднакласнік паступіў вучыцца, як у іхняй вёсцы казалі: "на артыста". І падумаў: "А чым я горшы за яго? Давай і я паспрабую!"

Першай яркай роляй Ламана стаў Тэймураз Джакелі ў спектаклі "Не трывожся, мама!" паводле Н.Думбадзэ ў рэжысуры Барыса Эрына. А потым, амаль адразу, — Юрась у "Несцерцы". Спектакль — візітоўка тэатра, з 1941 года ў рэпертуары. Першы выканаўца ролі Юрася — народны артыст Беларусі Анатоль Шэлег, і для Ламана гэткая эстафета аказалася адказнай і ганаровай. Зрэшты, акцёр вывучыў на памяць фактычна ўсе мужчынскія ролі ў спектаклі, так што аднойчы без праблем замяніў у ім выканаўцу ролі Шкаляра. Але па-акцёрску — марыў пра Несцерку. Падглядаў з-за куліс і за Фёдарам Шмакавым, і за Яўгенам Шыпілам, і за Валянцінам Салаўёвым, якім пашчасціла іграць гэтую ролю. Пад час апошняга аднаўлення спектакля ў 2006 годзе рашыўся выйсці на сцэну ў ролі Несцеркі. І — выклікаў шмат спрэчак: усе звыкліся з абліччам першых выканаўцаў — невысокіх, гарэзлівых, шпаркіх камедыйных акцёраў. А тут — артыст, знешне падобны на Янку Купалу, Максіма Багдановіча. Дарэчы, Багдановіча Пятро Ламан сыграў у тэлевізійным спектаклі, а Купалу — у спектаклі "Сон на кургане", пастаўленым Віталём Баркоўскім.

У апошняе дзесяцігоддзе акцёру шанцавала на цікавыя работы. У спектаклі "Фрэкен Юлія" А.Стрындберга Антон Грышкевіч даручыў яму ролю спакусніка Жана, у "Тузах" У.Відмера Віталь Баркоўскі прапанаваў сыграць разгубленага, "прыбітага" жыццём Краўзэ, у "Кракаўскім студэнце" Г.Марчука Валерый Анісенка прызначыў Ламана на ролю "чалавека без радзімы" Тураўца, у "Памінальнай малітве" Р.Горына Юрый Пахомаў убачыў акцёра Ураднікам, які спачувае, але нічым не можа дапамагчы Тэўе і ягонай сям'і, а ў спектаклі "Ён. Яна. Акно. Нябожчык" той жа рэжысёр даў артысту камедыйную ролю "пакутніка" Роні. У прэм'еры ж "Апошнія сведкі" паводле С.Алексіевіч, прысвечанай 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, па волі рэжысёра Уладзіміра Савіцкага акцёр успамінае маленства ад імя дзяцей вайны Парабковіча і Сівакова.

19 ліпеня Пятро Ламан выйдзе на Коласаўскую сцэну ў ролі Несцеркі. Выйдзе, каб сустрэцца са сваім любімым гледачом, якому служыць амаль сорак гадоў. Коласаўцы павіншуюць свайго шчырага сябра, артыста, адданага нацыянальнаму тэатру, з юбілеем.

Святлана ДАШКЕВІЧ,
загадчык літаратурна-драматычнай часткі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа

На здымках: Пятро Ламан у вобразах Несцеркі (зверху) і Янкі Купалы, увасобленых на сцэне тэатра.

"Воўк" і дзейныя асобы

Значны ўнёсак ва ўмацаванне дружбы паміж народамі зрабіў і народны артыст Расіі, заснавальнік і рэжысёр маскоўскага "Тэатра на Паўднёвым Захадзе" Валерый БЕЛЯКОВІЧ, якога запрашаюць ставіць спектаклі нават у Амерыку і Японію, а ўсяго ён іх ажыццявіў ажно 139!

Са сваім тэатрам Беляковіч у Беларусі аказаўся ўпершыню, хоць кожнае лета ездзіць з сям'ёй адпачываць у вёску на Піншчыне, дзе жывуць шматлікія сваякі ягонага бацькі: "Беларуская вёска адраджаецца літаральна на вачах, а матчынай роднай вёскі пад Разанню ўжо няма: памерла разам са сваімі апошнімі старымі". Дый па нацыянальнасці В.Беляковіч не толькі адчувае сябе беларусам, а з'яўляецца ім афіцыйна: "У вайну Беларусь страціла кожнага чацвёртага, і калі ў 16 гадоў я атрымліваў пашпарт, вырашыў крыху паправіць гэтую сітуацыю, хаця і нарадзіўся ў Маскве: хай беларусаў будзе больш!" Звяртаўся ён і да беларускай драматургіі: гадоў 20 таму па просьбе адной з вядомых расійскіх артыстак ставіў "Злом" Аляксея Дударава.

Версій таго, як лёс звязаў В.Беляковіча з тэатрам, на "Зорнай гадзіне" было агучана дзве. І абедзве — з вуснаў яго самога. Такі вось "рэжысёрскі" прыёмчык! Версія першая: "Мы жылі ў рабочым пасёлку. Вось я і захацеў быць артыстам, бо там, на экране, было іншае жыццё". Версія другая: "Не магу гуляць у футбол. У дзяцінстве стаў аднойчы на вароты, а мне як далі мячом па твары — вось я і пайшоў у рэжысёры: тут мяне ніхто не заткне за пояс!"

Адметны вопыт "вынес" В.Беляковіч з гісторыі сусветнага тэатра: "Я не падзяляю спектаклі на "тэатр паказу", як у Неміровіча-Данчанкі, і "тэатр суперажывання", паводле Станіслаўскага. Аснова ўсіх асноў — тэатр народны, што выйшаў з плошчаў. Трэба іграць так, каб усё было зразумела і тады, калі раптоўна "выключыцца гук". І калі, наадварот, "выключыцца карцінка". І нават калі пры гэтым артысты будуць размаўляць на іншай мове! Бо ёсць жа яшчэ і інтанацыя, і эмацыйны пасыл! У праграмках невыпадкова пішуць: "Дзейныя асобы". Артысты павінны дзейнічаць! Чым больш на сцэне руху, тым лепей. Кожны рэжысёр павінен сам выхоўваць сабе артыстаў. Я так і раблю. Здараецца, і сварыся з імі, і "аблаю" перад спектаклем. А то прыехалі, бачыце, на фестываль, расслабіліся, ходзяць сабе па горадзе, "кайфуюць". А раззлуюцца на мяне — і сыграюць, бы ў першы і апошні раз, на шалёнай энергетыцы. Дый сваім прыкладам я іх "натхняю": і паказваю сам, і іграю разам з імі на сцэне. Таму не люблю, калі яны сыходзяць у іншыя тэатры. Але калі іх запрашаюць у кіно, радуюся разам з імі: заробкі там куды вышэйшыя. Ды ўсё ж добра, што крызіс адбіўся на кіна-індустрыі: артысты сталі менш здымацца ў кіно і больш працаваць у тэатры".

Сяброў сярод рэжысёраў у В.Беляковіча няма: "Рэжысёры — гэта ваўкі-адзіночкі: кожны — на чале сваёй зграі". Тым не менш, нашаму Валерыю Анісенку, які прыехаў у Віцебск на абодва спектаклі тэатра — "Лялькі" і "Майстар і Маргарыта", — ён падарыў вялізны альбом "Тэатр на Паўднёвым Захадзе" з дарчым надпісам. Дык, можа, гэты ўжо папраўдзе легендарны тэатр мы ўбачым, нарэшце, і ў Мінску?

Н.Б.

Ромбакубаактаэдр да Вінчы

Нацыянальная бібліятэка Беларусі не перастае здзіўляць не толькі каштоўнасцямі, якія захоўвае, але і сваёй незвычайнай формай. Самы вялікі ў свеце ромбакубаактаэдр прываблівае не толькі турыстаў, але і людзей, зацікаўленых у яго вывучэнні і даследаванні. Менавіта цікавая, нават незвычайная для архітэктурнага збудавання форма галоўнай бібліятэкі Беларусі звярнула на сябе ўвагу французскага мастака Рафаэля Зарка.

Фота nlb.by

Разам са сваёй здымачнай групай ён наведаў нашу краіну, каб стварыць дакументальны фільм пра беларускую скарбніцу, яе незвычайную форму і ўнутраную арганізацыю. Па словах самога мастака, ромбакубаактаэдр цікавіць яго ўжо даўно. Першы раз ён убачыў гэтую форму ў трактаце Лука Пачыолі "Боская прапорцыя", дзе яна была ўпершыню змешчана ў 1509 годзе. Дарэчы, аўтарам ілюстрацыі быў сам Леанарда да Вінчы. Гэтая форма настолькі захапіла Зарка, што з таго часу ён пачаў шукаць яе ўвасабленні па ўсім свеце, і, нарэшце, натрапіў на беларускую бібліятэку. Творца нават захапіў з сабой копію старажытнага манускрыпта, каб на ўласныя вочы ўпэўніцца ў адпаведнасці сучаснага будынка гістарычнаму прататыпу.

Здымкі французская дэлегацыя плануе весці да 21 ліпеня. За час працы яе прадстаўнікі ўжо паспелі пазнаёміцца з інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэкі, структурай чытальных залаў, сістэмай абслугоўвання чытачоў, архітэктурнымі асаблівасцямі і ўнутраным аздабленнем. Для таго, каб перадаць вонкавую велічнасць і маштабнасць "дыямента", групе нават давялося здымаць яго з даху суседняга будынка. У бліжэйшыя дні французы плануюць зняць бібліятэку знутры, у тым ліку і памяшканні, куды звычайным чытачам заходзіць забараняецца.

Ідэю арганізаваць здымкі дакументальнага фільма падтрымалі ў Цэнтры мастацтваў горада Жэнвілье (Галерэя Эдуарда Манэ). Менавіта там, ужо ў верасні, пад час персанальнай выстаўкі маладога мастака, і адбудзецца прэм'ера дакументальнага фільма.

Д.Д.

Падабенства менавіта з такім ромбакубаактаэдрам (зверху), намаляваным Леанарда да Вінчы, і натхніла Рафаэля Зарка зняць стужку ў нашым "дыяменце".

Базіс рэгіёна: кадравыя праблемы

Маладыя спецыялісты для Лагойскага раёна: знайсці і... замацаваць

Колькі вострых вуглоў у кадравага трохкутніка?

Што патрэбна для таго, каб малады спецыяліст змог замацавацца на сваім першым працоўным месцы? Якія фактары і "зоркі" мусяць сысціся ў адно, каб сустрэча гэтая сталася не толькі прыемнай, але ўзаемна карыснай і плённай? Здавалася б, складнікі гэтыя ляжаць на паверхні, у межах амаль класічнага "трохкутніка", і не гаворыць пра іх хіба толькі абыякавы: цікавая творчая работа, годная заработная плата і жыллё. Але ж ці заўсёды гэтая трыяда здольная забяспечыць той вынік, на які разлічваюць мясцовыя ўлады, запрашаючы да сябе па размеркаванні маладых спецыялістаў?

Пра гэта думалася па дарозе на Лагойшчыну. Рэгіён выклікаў інтарэс нашай рубрыкі акурат з прычыны кадравых праблем. Перспектыўны раён, які актыўна і дынамічна развіваецца, сучасная буйная турыстычная зона, што прыцягвае інтарэс не толькі беларусаў, але і замежнікаў, непасрэдная блізкасць да сталіцы — здавалася б, што яшчэ патрэбна маладому амбіцыйнаму культработніку для таго, каб з першых жа крокаў у прафесіі трывала стаць на ногі і, разам з тым, мець магчымасць для плённай рэалізацыі ўласных творчых планаў ды памкненняў?

Аднак на паверку аказалася, што ўсе гэтыя "плюсы" так і не змаглі самі па сабе забяспечыць сетцы ўстаноў культуры Лагойскага раёна трывалага прытоку ініцыятыўных маладых спецыялістаў.

Ракіроўкі і тэндэнцыі

Агульная карціна галіны культуры рэгіёна не сведчыць пра відавочныя кадравыя пытанні. Тым не менш, за апошні год змянілася кіраўніцтва раённай Цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы, Дома рамёстваў, Цэнтра культуры, дзіцячых школ мастацтваў у Лагойску і Плешчаніцах. Зрэшты, і начальнік аддзела культуры Лагойскага раёна Пётр Вабішчэвіч таксама працуе на сваёй пасадзе ўсяго толькі год. Гэта, безумоўна, паказвае, што мясцовая ўлада дбае пра эфектыўнасць дзейнасці галіны. Таму і інтанацыя гэтага артыкула натуральным чынам рушыла не столькі ў рэчышча пошуку таго, як разблытаць складаныя кадравыя "вузлы". Важнейшым за гэтае падаецца знайсці, куды сёння можна "выруліць" з праблемамі, што чакаюць на Лагойшчыне свайго неадкладнага вырашэння.

— Мы, — кажа Пётр Вабішчэвіч, — практычна кожны год запрашаем да нас у раён на працу маладых спецыялістаў — выпускнікоў ВНУ сферы культуры. Але бяда нашага прысталічнага рэгіёна і корань пастаяннай кадравай незадаволенасці Лагойшчыны заключаюцца ў тым, што да нас традыцыйна імкнецца размеркавацца як мага больш мінчан. Не хачу сказаць нічога дрэннага пра іх як пра спецыялістаў, але праходзіць два гады — і амаль сто працэнтаў з іх вяртаюцца ў сталіцу. Вось і атрымліваецца: з'язджае чалавек — а разам з ім з'язджаюць і напрацоўкі. Таму яго-ным наступнікам на тым самым месцы фактычна даводзіцца пачынаць працу з нуля.

У гэтым годзе я асабіста прысутнічаў на размеркаваннях ва ўсіх навучальных установах галіны культуры, выпускнікі якіх нас патэнцыйна цікавяць. У выніку чакаем на працу 8 маладых спецыялістаў. Сёлета нашай прынцыповай установкай, нягледзячы на пэўны кадравы "голад", была адмова ад запрашэння на працу мінчан. Мы разумеем, што год-два давядзецца "ператрываць", але ж канкрэтныя рэаліі жыцця даводзяць: мы можам рабіць стаўку толькі на прадстаўнікоў свайго раёна.

Што ж, пэўны кадравы рэзерв у Лагойшчыны маецца: на сённяшні дзень у навучальных установах культуры на розных формах навучання атрымліваюць адукацыю 73 студэнты з раёна, прычым 26 спецыялістаў павышаюць кваліфікацыю завочна, у тым ліку 10 —з вясковых устаноў культуры.

На фоне гэтых лічбаў зусім паіншаму выглядае і такі факт: з 16 маладых спецыялістаў, якія прыехалі на працу ва ўстановы культуры Лагойскага раёна летась, за гэты час пераразмеркаваліся ўсяго 3 чалавекі. Многа гэта ці мала — пытанне рытарычнае, бо як не паставіцца з разуменнем да таго, што дзяўчына пасля заканчэння ВНУ бярэ шлюб і хоча надалей жыць ды працаваць побач са сваім мужам?.. Прынамсі, начальнік аддзела культуры зазначае: збольшага маладыя спецыялісты добра ўпісаліся ў калектывы раёна і ўжо пэўным чынам зарэкамендавалі сябе як цікавыя і актыўныя работнікі. У якасці ўзору называе — Таццяну Гайдукевіч. Яна працуе мастацкім кіраўніком Гасцілавіцкага сельскага дома культуры, паспела правесці ў раёне некалькі яркіх і запамінальных мерапрыемстваў. "Таму, калі ў яе будзе жаданне застацца ў нас, — кажа з надзеяй Пётр Вабішчэвіч, — мы перавядзём Таццяну на працу ў Лагойскі гарадскі дом культуры, дзе ў яе з'явіцца яшчэ больш магчымасцей для творчай самарэалізацыі".

Жыллёвае пытанне

Што ж Лагойшчына можа прапанаваць маладым спецыялістам у якасці прывабных "казыроў"-аргументаў? Начальнік аддзела культуры бачыць у якасці іх актыўнае развіццё раёна ў вытворчай галіне і ў плане агульнага добраўпарадкавання ды будаўніцтва. Не сакрэт, што штуршок тут далі два гарналыжныя комплексы, якія актывізавалі турызм на Лагойшчыне, а значыць — і развіццё сферы паслуг.

Вельмі абнадзейлівыя прагнозы дае начальнік аддзела культуры і адносна "кватэрнага пытання". Зараз на ўзроўні раённай улады абмяркоўваецца пытанне аб стварэнні жыллёвага кааператыву з ліку работнікаў бюджэтнай сферы, куды змогуць увайсці і тыя 9 чалавек, што стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў непасрэдна ў аддзеле культуры. Таму на працягу двух бліжэйшых гадоў гэтая праблема мусіць быць знятая. Ну, а пра тое, што падобныя прагнозы маюць пад сабой рэальную глебу, сведчыць той факт, што летась, і "К" пра гэта пісала, райвыканкам Лагойска перадаў аддзелу службовую чатырохпакаёвую кватэру з мэтай прыстасавання яе пад інтэрнат для маладых спецыялістаў, дзе сёння і пражывае жаночая "частка" маладых культработнікаў раёна.

Аднак, канешне ж, жыллёвы аптымізм, мусім дадаць, мае месца хіба што ў дачыненні да тых маладых спецыялістаў, якія атрымліваюць працу непасрэдна ў Лагойску. А вось калі ты прыязджаеш у невялікую вёску — туды, дзе капітальнае жыллёвае будаўніцтва проста не прадугледжана, — разлічваць можаш адно толькі на сябе. Таму за межамі райцэнтра малады спецыяліст спадзяецца хіба на пошукі "кута" ў прыватным сектары. Калі аддзелу і, адпаведна, вяскоўцам "пашчасціць" — то за час разменкавання такі навічок возьме шлюб з мясцовым жыхаром і, магчыма, замацуецца тут, а калі не — надзеі на доўгую працу практычна няма.

І ў гэтым сэнсе надзвычай паказальная вастрыня кадравай праблемы ў Калачынскім доме культуры, дзе ёсць вакансіі дырэктара і мастацкага кіраўніка. Здаецца, сама па сабе ўстанова культуры выглядае надзвычай прывабна. Дзякуючы таму, што аграгарадок "Калачы" быў здадзены летась, у Доме культуры зрабілі вялікі рамонт, і будынак, які быў практычна без гаспадароў і больш за 10 гадоў не ацяпляўся, займеў, нарэшце, нармальныя ўмовы для працы. Але ёсць "дом", ды няма для яго ўвішных "гаспадароў"-культработнікаў — каб маглі музычнымі інструментамі валодаць і ўмелі працаваць з людзьмі. "Ідэальным варыянтам для Калачынскага СДК, — кажа Пётр Вабішчэвіч, — была б сямейная пара..." Ды яе пакуль няма.

Матэрыяльны падмурак крэатыву

Увосень на Лагойшчыне плануецца правядзенне раённага конкурсу на лепшую ўстанову культуры сельскай мясцовасці, прычым ацэньвацца будзе як канкрэтная праца ўстановы на працягу года, так і паўгадзінная творчая "візітоўка"-справаздача, якая будзе ўключаць і выступленне творчых калектываў, і, пажадана, фотаматэрыялы, невялічкі відэафільм. Няўжо ў вясковых установах культуры Лагойшчыны сёння ёсць магчымасць і матэрыяльная база для таго, каб уласнымі сіламі зняць відэафільм? Кіраўнік аддзела культуры прыцішае мой імпэт, прызнаючы, што многае ў гэтым накірунку робіцца за кошт уласных сродкаў і тэхнікі саміх работнікаў культуры.

Хаця не так даўно з пазабюджэтных сродкаў аддзелам культуры былі закуплены два ноўтбукі для Лагойскага ГДК і для Цэнтра культуры, якія значна спрасцілі і палепшылі якасць работы, тэхнічная мадэрнізацыя іншых устаноў раёна — справа надзвычай актуальная. Цалкам пагаджаюся: два новыя ноўтбукі на ўвесь раён, якія, да таго ж, "аселі" ў самім Лагойску, — гэта, бы кропля ў моры. Бо не сакрэт, што сёння тэхніка крочыць наперад проста гіганцкімі тэмпамі, і дастаткова 3 — 5 гадоў,

Між іншым, пра тэхнічны "голад" у сваёй сферы і адчувальнасць састарэласці камп'ютэрнага парку ЦБС кажа яе дырэктар Вера Балцэвіч, адзначаючы, што сёння бібліятэкі трапілі ў такую моцную інфармацыйную плынь, дзе кніга — гэта толькі невялічкая частка сферы дзейнасці. На жаль, яны не заўсёды гатовыя задаволіць новыя інфармацыйныя патрэбы насельніцтва. І, нягледзячы на тое, што сталіца зусім побач, у Лагойскім раёне далёка не ва ўсіх бібліятэках ёсць магчымасць доступу да Інтэрнета з-за адсутнасці тэлефанізацыі саміх устаноў, не кажучы ўжо пра працу з новымі інфармацыйнымі сістэмамі.

Што ж, дадумваю я далей, магчыма і гэта з'яўляецца адной з важкіх прычын таго, што з усяго, няхай і нешматлікага, кола маладых спецыялістаў, якія за апошнія два гады па размеркаванні прыязджалі на працу ў бібліятэчную сістэму Лагойшчыны, толькі адзін "дабыў" да канца свой тэрмін і не пераразмеркаваўся ў іншы рэгіён... І ў гэтым я іх разумею: маладыя спецыялісты сутыкаюцца з тым, што ўсе іхнія навыкі, напрацоўкі, веданне сучасных тэхналогій і арыентацыя на новыя формы работы, у тым ліку і з насельніцтвам, не знаходзяць свайго прымянення на практыцы.

Прыкладам цудоўнай "пляцоўкі" для таго, каб заявіць аб сабе як аб прафесіянале, стаў для мяне Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей імя К. і Я. Тышкевічаў. Прынамсі, я не магла не адзначыць таго, што залы музея, з пункта гледжання функцыянальнасці, вельмі якасна прадуманы і адпаведным чынам абсталяваны, таму не толькі ў самой экспазіцыі, але і ў выставачнай зале работы, як кажуць, не "на цвічках". І пад-

обны ўзровень экспазіцыйнай культуры сведчыць не толькі пра клопат гарадскіх улад, якія на пачатку 2000-х уводзілі ў эксплуатацыю Цэнтр культуры, дзе і месціцца музей, але і, не ў меншай ступені, — пра імкненне саміх музейных работнікаў не быць "правінцыяламі" паводле свайго творчага мыслення.

Зрэшты, гледзячы на маладога дырэктара музея Святлану Жыгунову, не дапускаеш сумненняў: нярэдка менавіта маладыя кадры на чале ўстаноў культуры здольныя надаваць ім пэўны жывы імпульс. Святлана Ігараўна працуе ў музеі тры з паловай гады, з якіх два — на пасадзе дырэктара. І, пры ўсёй сваёй немалой адміністратыўнай нагрузцы, знаходзіць магчымасць займацца навуковай работай. Цудоўна, калі матэрыяльны падмурак дае магчымасці для рэалізацыі ўласных навукова-даследчых інтарэсаў у рэчышчы пэўных практычна-вытворчых задач сваёй установы.

Дзе адшукаць "тумбачку" з грашыма?

Працягваючы "матэрыяльную" тэму, Пётр Вабішчэвіч вымушаны канстатаваць: па выніках мінулага года заробак работнікаў культуры сярод усіх галін раёна займае "ажно" другі радок знізу: у сярэднім — 560 тысяч у месяц. Механізмы "карэкціровак" гэтых лічбаў у бок хаця б невялікага павелічэння вядомыя: "дагрузка" спецыялістаў яшчэ на палову стаўкі, а таксама — увядзенне гасразліковых адзінак. У Лагойскім раёне сярод іх — кіраўнік духавога аркестра, метадыст па рабоце з дзецьмі, некаторыя іншыя спецыялісты Цэнтра культуры. Безумоўна, гэта пэўная нагрузка на спецрахунак аддзела культуры, але як іначай? Да прыкладу, у снежні мінулага года раённы калектыў "Жывіца" абараніў званне народнага, але магчымасці знайсці бюджэтную стаўку для яго кіраўніка так і не знайшлося, — дапамог гасразлік.

Аднак і спецрахунак неабходна папаўняць, і размовы пра платныя паслугі насельніцтву і пазабюджэтную дзейнасць сёння адной са сваіх задач ставяць пошукі прыхаваных рэзервовых магчымасцей для паляпшэння дабрабыту работнікаў культуры. Ды на Лагойшчыне шукаць чорнага ката ў цёмным пакоі доўга не трэба: навідавоку — турыстычны вектар рэгіёна, які пэўным чынам канцэнтруе вакол сябе і іншыя сферы інфраструктуры. Вось толькі пад час размовы з шэрагам кіраўнікоў установаў культуры ў мяне склалася ўражанне, што акурат гэты накірунак дзейнасці пакуль яшчэ застаецца неўзаранай цаліной. Хаця, здавалася б, на руках усе козыры: бяры "за рогі" турыстычны бізнес і інтэгруй у яго культурны складнік, насычаючы актыўны "фізкультурны" адпачынак творчай "начынкай". А за кошт атрыманых прыбыткаў стымулюй матэрыяльна ініцыятыву тых жа маладых спецыялістаў, якія і самі з задавальненнем уключацца ў такую крэатыўную рэалізацыю прывабных ідэй і пачынанняў.

— Мы хацелі б, каб тыя работы, што ствараюцца і ў Лагойскім доме рамёстваў, і народнымі майстрамі на вёсцы, — кажа Пётр Вабішчэвіч, — не толькі выстаўляліся пад час буйных масавых святаў, але і адпаведным чынам рэалізоўваліся. І райвыканкам пайшоў нам насустрач: унесены змяненні ў Палажэнне аб аддзеле культуры, дзякуючы чаму на сённяшні дзень атрыманы дазвол на рэалізацыю сваёй прадукцыі, узгоднены яе пералік. Зараз наша задача — знайсці ў Лагойску памяшканне, прыдатнае для таго, каб адкрыць тут гандлёвы пункт па рэалізацыі сувенірнай прадукцыі.

Цалкам пагаджаюся з гэткай пазіцыяй, бо і сама з разнастайных вандровак ды камандзіровак з задавальненнем прывожу дадому невялічкія сувеніры-напамінкі. А колькі на Лагойшчыне такіх "вандроўнікаў", акрамя тых, хто наведвае гарналыжныя комплексы! Вось дзе рэзерв, які здолеў бы, з аднаго боку, ажывіць інтарэс прыезджых турыстаў да культуры Лагойшчыны, а з другога — даць дадатковы імпульс для эканамічнага развіцця галіны, пашырэння сеткі тых жа самых платных паслуг, якіх у раённым пераліку — каля 70 найменняў. Але практыка паказвае, што далёка не ўсе яны актыўна запатрабаваны насельніцтвам. А, між тым, гэта яшчэ адзін, мала задзейнічаны, але надзвычай перспектыўны, вектар прымянення творчых сіл маладых спецыялістаў, якія, з аднаго боку, могуць праявіць сваё крэатыўнае мысленне ў рэальнай дзейнасці, атрымліваючы ад гэтага вынікі як у выглядзе творчага плёну, так і, не менш істотна, — у якасці матэрыяльнай падтрымкі ўласнага бюджэту.

***

Вяртаючыся з камандзіроўкі, злавіла сябе на думцы, што пасля наведвання Лагойшчыны ў мяне пэўным чынам змянілася ўяўленне пра той самы "кадравы трохкутнік", які з'яўляецца каменем спатыкнення ў пытанні замацавання маладых спецыялістаў галіны культуры. Відавочна, што на першае месца сёння выходзіць справа прафарыентацыйнай падрыхтоўкі маладых кадраў, і яна — безумоўны і абавязковы клопат мясцовага кіраўніцтва. Таму што сярэдняя спецыяльная ці вышэйшая навучальная ўстанова здольная даць чалавеку адпаведную адукацыю, забяспечыць яго працоўным "інструментарыем", а вось заахвоціць да далейшай працы па спецыяльнасці, стварыць матэрыяльныя і маральныя перадумовы да таго, каб малады спецыяліст з гатоўнасцю аддаваў уласныя сілы, веды і ідэі на карысць галіны і тых канкрэтных людзей, якія складаюць кола яго "культурных спажыўцоў" у канкрэтным рэгіёне, няхай гэта раённы цэнтр, аграгарадок ці нават аддаленая вёска, — гэта мусіць быць першачарговая задача кіраўнікоў саміх установаў культуры. І, аказваецца, клапаціцца пра кадравую моц варта пачынаць яшчэ да паступлення будучых спецыялістаў на вучобу: дзеля таго, каб іхняй канчатковай мэтай было не атрыманне "корачкі", а цвёрдая перакананасць у тым, што іх праца будзе запатрабавана і годна ацэнена, і не "ўвогуле", а ў канкрэтным рэгіёне, у сябе на радзіме. Бо нездарма кажуць: дзе нарадзіўся, там і згадзіўся.

Таццяна КОМАНАВА,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Лагойск — Мінск
Фота аўтара

2.

3.


4.


5.

На здымках:
1. Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр "Сілічы";
2. Лагойскі раённы цэнтр культуры;
3. Маладыя спецыялісты з Гасцілавічскага СДК дырэктар Алеся Гарагляд і мастацкі кіраўнік Таццяна Гайдукевіч;
4,5. Шэрагі кіраўнікоў установаў культуры раёна на працягу года істотна змяніліся.

Каментарый з нагоды

Курс — на "вырошчванне" ўласных кадраў

Свае каментарыі да сітуацыі з маладымі спецыялістамі на Лагойшчыне дае начальнік упраўлення навучальных установаў і кадраў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталля ШМАКАВА:

— Сітуацыя з размеркаваннем маладых спецыялістаў у Лагойскі раён сапраўды шмат у чым унікальная. Згодна са статыстычнымі данымі, падрыхтаванымі нашым упраўленнем, за апошнія пяць гадоў у гэты рэгіён было накіравана 19 чалавек! Па Мінскай вобласці Лагойшчына займае другое месца па колькасці (разам з Пухавіцкім раёнам), больш размеркавалася толькі ў Мінскі раён, але гэта, відавочна, у асноўным, мінчане, якім на працу даехаць часам нават хутчэй і прасцей, чым у іншы куток сталіцы. Ды і, калі паглядзець па іншых абласцях рэспублікі, такой вялікай колькасці маладых спецыялістаў, размеркаваных у адзін раён, больш няма.

Так, прадстаўнікі Лагойскага раёна прысутнічаюць на размеркаваннях у нашых ВНУ, але калі пачынаецца ўласна "гандаль" за маладога спецыяліста, іхні адказ: жыллё не прадастаўляем. У той час як у іншых рэгіёнах гэтае пытанне мае рашэнні: адны прапануюць пакой у інтэрнаце, другія — службовую кватэру, катэджы, магчымасць будаўніцтва ўласнага жылля… Сёлета Лагойскі раён адмовіўся ад запрашэння мінчан, матывуючы гэта тым, што яны стараюцца не "затрымлівацца" ў раёне. Але калі не будзе бачна перспектыў у вырашэнні жыллёвага пытання, наўрад ці варта спадзявацца, што затрымаюцца і "немінчане". Гэта добра, што намецілася перспектыва будаўніцтва жылля для работнікаў бюджэтнай сферы. Але ж гэта ў горадзе, а ў раёне сітуацыя сапраўды нярадасная. І нават калі ў вёсцы не жыць, а ездзіць на працу на маршрутцы, можна лёгка падлічыць, у якую суму гэта абыдзецца.

Калі гаварыць пра сітуацыю з забеспячэннем маладых спецыялістаў у галіне культуры жыллём, то мушу сказаць, што паціху, няспешна, але сітуацыя ссоўваецца з "мёртвай кропкі". Прычым самае важнае, што зацікаўленасць і пошукі рашэнняў праяўляюцца сёння ўжо і на ўзроўні мясцовых улад. Раней яны проста адмахваліся, матывуючы гэта першасным клопатам пра спецыялістаў у аграрнай сферы. Але сёння ўжо ёсць разуменне таго, што старая ісціна "Не хлебам адзіным жывы чалавек" не страціла сваёй актуальнасці.

Так, калі прааналізаваць існуючую карціну, па нашых падліках прыкладна 30% з'язджаюць з першага месца працы, перараз мяркоўваюцца. Але давайце паглядзім на гэтую лічбу з іншага боку: 70% маладых спецыялістаў — застаюцца! І ўжо справа мясцовых улад — зрабіць так, каб яны стала замацаваліся.

Я думаю, што ў дадзеным выпадку рацыянальны і правільны курс — на "вырошчванне" ўласных кадраў. І кіраўніцтва аддзела культуры Лагойскага раёна гэта разумее, адсочвае тых сваіх выхадцаў, што навучаюцца на профільных спецыяльнасцях. А для таго, каб гэтая "сцяжына" прывяла маладых спецыялістаў дадому, неабходны ўпор на прафарыентацыю. Не сакрэт, што пры дамах культуры заўсёды існуе купка актывістаў, якія займаюцца ў гуртках мастацкай самадзейнасці. Да іх трэба прыглядацца, працаваць з імі, заахвочваць да паступлення ў навучальныя ўстановы культуры. Для гэтага ёсць шмат спосабаў: і вядомыя многім "круглыя сталы", і запрашэнне спецыялістаў з ВНУ. Урэшце, не варта забывацца і пра такую форму заахвочвання, як мэтавае накіраванне на вучобу. Чаму б не накіраваць сваіх абітурыентаў-мэтавікаў у той жа Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў? Летась, да прыкладу, там быў недабор на такую каштоўную для рэгіёнаў спецыяльнасць, як "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" з дадатковай спецыяльнасцю "беларуская мова". Ці, у дачыненні да Лагойскага раёна, дзе, як вы слушна адзначаеце, немалую ролю адыгрывае наяўнасць у рэгіёне магутнай турыстычна-адпачынкавай зоны, можна згадаць адкрытую ў гэтым годзе спецыяльнасць "сацыяльна-культурная дзейнасць у санаторна-аздараўленчых і турыстычна-спартыўных установах", якая, мы спадзяёмся, дасць проста універсальныя навыкі для маладых спецыялістаў.

А як у суседзяў?

Дарэчы будзе ўзгадаць і ўзорны вопыт Случчыны, дзе праца з маладымі спецыялістамі і кадравымі культработнікамі наладжана на высокім узроўні.

Як расказала "К" галоўны спецыяліст аддзела культуры Слуцкага райвыканкама Марыя Несцярчук, яшчэ ў 2006 годзе тут была распрацавана праграма "Кадры культуры", разлічаная да 2010 года. Для аптымізацыі работы з культработнікамі была набыта і ўсталявана электронная праграма "Кадры", дзе створаны рэестр, сфарміраваны банк даных, падабраны кандыдатуры з ліку перспектыўных супрацоўнікаў.

Асноўную стаўку на Случчыне робяць на мясцовыя кадры. Штогод студэнтамі навучальных устаноў культуры і мастацтва становяцца 8 — 10 чалавек. Толькі за апошнія два гады у раён прыбылі 37 маладых спецыялістаў, з іх 25 — жыхары Слуцкага раёна.

Замацаванню маладых спецыялістаў садзейнічае і рашэнне Слуцкага райвыканкама аб выплаце адначасовай матэрыяльнай дапамогі на першапачатковае ўладкаванне ў памеры 10 базавых велічынь. Усе супрацоўнікі галіны культуры раёна забяспечваюцца месцамі ў інтэрнатах, а ў 2007 годзе быў арганізаваны жыллёва-будаўнічы кааператыў "Культработнік", у які ўключаны тыя, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (38 чалавек). Сёлета распачата будаўніцтва гэтага дома.

Паляпшаюцца жыллёвыя ўмовы культработнікаў у гэтым годзе і на раёне. Так, дом у вёсцы Падлессе атрымала сям'я Гасанавых: муж і жонка працуюць тут дырэктарам і мастацкім кіраўніком СДК, а таксама ў пакой у інтэрнаце аграгарадка "Вежы" пераехаў дырэктар мясцовага СДК.

Быў у Маладзечне баль...

10 — 11 ліпеня ў Маладзечне прайшлі Дні польскай культуры Мінскай вобласці. Свята сталася ўжо традыцыйным: яно праводзіцца чацвёрты раз.

У дзень адкрыцця свята ў Маладзечне адбылося наведванне касцёла Святога Іосіфа дэлегацыямі раёнаў Міншчыны, іншых рэгіёнаў Беларусі, гасцямі з суседняй краіны — прадстаўнікамі Кутноўскага раёна і горада Дамброва Сакульскага раёна Рэспублікі Польшча. 11 ліпеня ў маладзечанскай гарадской бібліятэцы прайшло адкрыццё выставак мясцовага мастака Эдуарда Мацюшонка, польскай літаратуры, экспазіцыі "Польскія манеты на Беларусі 1918 — 1939 гадоў".

З прывітальным словам да ўдзельнікаў звярнуліся намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Ламека, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана Герасімовіч, намеснік старшыні Маладзечанскага райвыканкама Людміла Кананоўіч, старшыня Мінскага абласнога аддзела Саюза палякаў на Беларусі Мячыслаў Лысы. А затым распачаў сваю работу "круглы стол" "Роля польскай культуры ў фарміраванні духоўна-маральных каштоўнасцей і культурных традыцый беларускага народа". Пасля яго завяршэння ўдзельнікі Дзён культуры наведалі філіял музея Янкі Купалы ў вёсцы Яхімаўшчына.

Старшыня Мінскага абласнога аддзела Саюза палякаў на Беларусі Мячыслаў Лысы на адкрыцці фестывалю адзначыў: "Усе фестывалі польскай культуры праходзяць цікава, заўсёды — па-рознаму. Мы рады, што да нас прыязджаюць госці з Польшчы, дэлегацыі не толькі з Міншчыны, а і з суседніх абласцей. Чацвёрты Фестываль польскай культуры Міншчыны адметны яшчэ і тым, што сёлетні канцэрт у Палацы культуры мае менш фальклорны, а больш эстрадны накірунак".

Леанід Крупец (злева) уручае Мячыславу Лысаму (справа) прывітальны адрас.

Пад час святочнага канцэрта.

Святочная канцэртная праграма Дзён польскай культуры Міншчыны пачалася з віншавальных слоў старшыні Мінскага аблвыканкама Леаніда Крупца. "Гэтае свята, — адзначыў ён, — набыло сваю адметнасць, каларыт, стала дзейсным інструментам дружбы паміж беларускім і польскім народамі, паміж Беларуссю і Польшчай. Збіраючы яркія, самабытныя таленты, фестываль дэманструе народную творчасць, садзейнічае паглыбленню міжнацыянальнага даверу ў нашым агульным доме, імя якому — Беларусь".

Уладзімір Ламека ў сваім звароце да прысутных падкрэсліў, што беларускі і польскі народы злучае высокае мастацтва, якое не мае моўных бар'ераў, не мае межаў, але такое каштоўнае і дарагое для нас, беларусаў. Бо гэта — значны складнік агульнанацыянальнай культуры нашай дзяржавы, Рэспублікі Беларусь. У.Ламека зачытаў прывітальны адрас ад імя Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей рэспублікі Леаніда Гулякі.

Напрыканцы ж сваё майстэрства прадэманстравалі прафесійныя і самадзейныя артысты, якія прадстаўлялі беларускую і польскую культуры.

Наталля КІРПІЧЭНКАВА,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Маладзечна — Мінск
Фота Анатоля БАСАВА

Пройдзем пад "...Вясёлкай"?!

Здаўна людзі кажуць, што калі здолееш прайсці пад вясёлкай — здзейсняцца твае мары і будзеш шчаслівы...

І, між іншым, так яно і адбываецца на Дзяржынскім агульнараённым фестывалі-конкурсе выканаўцаў дзіцячай эстраднай песні "Крутагорская вясёлка". Яго ўдзельнікі — таленавітыя і, вядома ж, вельмі працавітыя і мэтанакіраваныя юныя спевакі і спявачкі ад пяці да пятнаццаці. Штогод, звычайна на працягу дзесьці двух месяцаў, сярод жадаючых праводзяцца адборачныя туры, пераможцы якіх збіраюцца на галоўнай сцэне раёна — у Дзяржынскім гарадскім доме культуры. Там і ладзіцца прыгожае свята выканаўчага мастацтва — фінальны гала-канцэрт.

Днямі "Крутагорская вясёлка-2009" сабрала жыхароў Дзяржыншчыны, шаноўных гасцей і, канешне ж, каля 40 фіналістаў. Пасля надзвычай яркага канцэртнага шоу, поўнага творчых ідэй, хвалюючых адкрыццяў і асаблівай "узроставай" абаяльнасці выканаўцаў, журы падвяло вынікі конкурсу.

Адметным было кожнае выступленне! Кранаючыя, звонкія галасы, цікавы, разнапланавы рэпертуар: ад народных і папулярных да патрыятычных кампазіцый. А з якім імпэтам дзейнічалі "групы падтрымкі" — родныя і сябры артыстаў! Сёння ўжо ўпэўнена можна казаць, што для пачаткоўцаў у эстраднай песні ў Дзяржынску конкурс набыў аўтарытэт трывалай прыступкі ў "кар'ернай лесвіцы". Нельга не пахваліцца дыпломамі з абласных, рэспубліканскіх і нават міжнародных конкурсаў удзельнікаў "...Вясёлкі". А Злата Ларчанка, пераможца 2007 года, сёння — у дзесятцы фіналістаў Рэспубліканскага дзіцячага конкурсу "Песня для "Еўрабачання-2009", і ўся Дзяржыншчына вельмі хвалюецца за сваю маленькую зямлячку, жадае ёй поспеху.

Варта ўлічваць і тую акалічнасць, што ў ходзе фестывалю дзеці атрымліваюць сапраўды слушныя заўвагі і парады ад журы, сваіх настаўнікаў і мастацкіх кіраўнікоў ды, што асабліва каштоўна, ад гасцей — прызнаных прафесіяналаў, якія традыцыйна запрашаюцца для актыўнага ўдзелу ў мерапрыемстве. Іншымі словамі — прагна вучацца, таксама — адзін у аднаго.

Наталля ТРАЦЭЎСКАЯ
Дзяржынск
На здымку: Аліна і Паліна Грудзько.

Спявай, як Штык!

"Шо посіеш, то пожнэш..." Так кажуць у вёсцы Дзівін, што на Кобрыншчыне. А сеюць тут, у тым ліку і на ніве культуры, выключна добра.

Летась вёска стала аграгарадком. Дзівінскі дом культуры з гэтай нагоды якасна адрамантавалі. Стараліся вельмі, бо пад адным дахам гэтай установы месяцца яшчэ дзве бібліятэкі (адна — дзіцячая), школа мастацтваў з харэаграфічным і інструментальным аддзяленнямі, Дом рамёстваў. Карацей кажучы, сапраўдны вясковы культурна-асветны цэнтр, дзе на кожным з двух паверхаў віруе жыццё. Творчага клопату хапае і малым, і пажылым, і людзям сярэдняга веку.

Як распавядае дырэктар СДК Алена Крачка, шмат ва ўстанове цікавостак, адна з іх — фальклорны гурт, што ўзначальвае мастацкі кіраўнік Фёдар Штык. Шэсць спявачак у калектыве: Галіна Штык — бальнічная санітарка, Ларыса Дарашук — майстар-метадыст па ткацтве Дома рамёстваў, Вера Кавальчук — памочніца выхавальніка мясцовага дома-інтэрната, Вольга Крачка — даярка, Таццяна Кацэвіч — работніца пякарні, Таццяна Брышуель — супрацоўніца СДК. У рэпертуары — каля сотні палескіх песень, родных і зразумелых кожнаму "дывінцу". Таму і прымаюць гурт паўсюль "на ўра".

Цікавіцца фальклорам і дзятва. Напрыклад, Коля — сын дырэктара Дома рамёстваў Наталлі Клімук — раз-пораз забягае на рэпетыцыі, "спрабуе голас". Глядзіш, праз час у калектыве мужчын паболее. Хіба ж дзіва: песню "пасееш" — песня і "прарасце".

Я.Р.
На здымку: мастацкі кіраўнік фальклорнага гурта Дзівінскага СДК Фёдар Штык.

Сёння беларуская дыяспара — гэта некалькі мільёнаў чалавек, што жывуць у розных краінах і на розных кантынентах. Нягледзячы на абставіны, нашы суайчыннікі за мяжой не губляюць сувязей з Радзімай, захоўваюць духоўныя каштоўнасці свайго народа. І прыкладам гэтаму — шматлікія імпрэзы, канцэрты, выстаўкі, што ладзяцца аб'яднаннямі беларусаў замежжа.

Землякі па ўсім свеце

Каб даведацца аб працы такіх арганізацый, наш карэспандэнт стэлефанаваўся з іх прадстаўнікамі. Сябры многіх гэтых аб'яднанняў прымуць удзел у рабоце V З'езда беларусаў свету.

У Расіі — самая вялікая беларуская дыяспара: каля мільёна чалавек, большасць з якіх удзельнічаюць у беларускіх культурных арганізацыях. Група энтузіястаў з Новасібірскага цэнтра беларускай культуры рэгулярна ладзіць народныя святы, аднаўляе старадаўнія абрады. І, трэба сказаць, іх дзейнасць будуецца не на пустой глебе. Як адзначыла дырэктар Цэнтра Ніна Кабанава, больш за два стагоддзі захоўвае сваю нацыянальную ідэнтычнасць цалкам беларуская вёска з дзіўнай назвай "Каўбаса", дзе існуе калектыў народных аўтэнтычных спеваў "Зязюля". І хоць Новасібірск ад Мінска аддзяляюць тысячы кіламетраў, па словах Ніны Васільеўны, мясцовыя музычныя калектывы са сваімі выступленнямі даволі часта наведваюцца на этнічную Радзіму. Так, нядаўна на святкаванне Дня Незалежнасці ў Гродна прыязджаў гурт "Сібірскія ўзоры".

Адна са старэйшых дыяспар нашых суайчыннікаў цягам ужо 55 гадоў дзейнічае ў гарадах Ізраіля і аб'ядноўвае больш за 130 тысяч чалавек. Як адзначыў старшыня Беларускага зямляцтва ў гэтай краіне Міхаіл Альшанскі, у захаванні сваіх каранёў вельмі вялікую дапамогу аказвае Пасольства Беларусі. У прыватнасці, дапамагае ў спрошчаным адкрыцці віз, перадае разнастайныя буклеты пра Радзіму. Апрача гэтага, рэгулярна адбываюцца выязныя консульскія вечары па ўсіх аддзяленнях зямляцтва. Не забываюцца прадстаўнікі пасольства наведваць культурныя мерапрыемствы ва ўсіх 33 гарадах Ізраіля, дзе прадстаўлена зямляцтва. У размове з карэспандэнтам "К" Міхаіл Альшанскі падкрэсліў важнасць традыцыі "Беларускага лесу" — штогадовага свята на вольным паветры каля аэрапорта горада Лод, куды збіраецца каля 5 — 10 тысяч чалавек, каб паглядзець канцэрт, падзяліцца ўспамінамі пра Беларусь.

У Польшчы жывуць дзесяткі тысяч нашых суайчыннікаў, пераважная большасць — на Беласточчыне. Менавіта там дзейнічае шэраг беларускіх таварыстваў, школ, асветніцкіх цэнтраў. Як адзначыў старшыня галоўнага ўпраўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Ян Сычэўскі, сёння пры генконсульстве дзейнічае Культурны цэнтр Беларусі ў Беластоку, які рэпрэзентуе беларускую культуру ў краіне, займаецца выставачнай дзейнасцю, актыўна супрацоўнічае з польскімі пазаўрадавымі арганізацыямі, школамі, займаецца стварэннем бібліятэкі з матэрыяламі пра гісторыю і сучаснасць Радзімы. Сярод найбольш значных мерапрыемстваў дыяспары Ян Янавіч адзначыў найперш святкаванне Купалля ў Белавежскай пушчы, якое цягам 25 гадоў збірае сваіх прыхільнікаў.

Напэўна, адна з самых актыўных — беларуская дыяспара ў Эстоніі. Вялікая роля ў гэтым, бясспрэчна, належыць старшыні Асацыяцыі беларускіх абшчын Эстоніі Ніне Савінавай. Варта толькі пералічыць некаторыя апошнія мерапрыемствы: штогадовае традыцыйнае свята ў Таліне "Спатканне", майстар-класы ў Цэнтры народных промыслаў з удзелам спецыялістаў з Беларусі. Апрача гэтага, шмат гадоў дзейнічае праграма па знаёмстве моладзі з беларускімі ВНУ. Нельга не адзначыць і унікальны праект "Знаёмая — незнаёмая Беларусь", дзякуючы якому адбываецца падарожжа прадстаўнікоў дыяспары на Радзіму. Гучыць у эстонскім радыёэфіры і штотыднёвая праграма на беларускай мове.

У далёкай Аргенціне беларуская дыяспара актыўна супрацоўнічае з Пасольствам Рэспублікі Беларусь у гэтай краіне. Так, па словах першага консула Сяргея Лукашэвіча, праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных Году роднай зямлі. Да таго ж, нашчадкі беларусаў актыўна ўдзельнічаюць у III Міжнародным беларускім конкурсе "Зямля і людзі: учора, сёння, заўтра". Як адзначыў Сяргей Лукашэвіч, сёлета ў Буэнас-Айрэсе адбудзецца канферэнцыя суайчыннікаў, на якой плануецца прыняць праграму дзейнасці на бліжэйшыя гады.

Дадам, што кожны з прадстаўнікоў беларускіх дыяспар, з кім давялося пагутарыць, падкрэсліў значнасць сталых кантактаў з Радзімай і прамовіў цёплыя словы прывітання ўсім землякам.

Кастусь АНТАНОВІЧ
На здымках: беларусы Эстоніі і Аргенціны пад час святаў нацыянальнай культуры ў гэтых краінах.

Запаветная мара Міколы Нікалаева

Безумоўна, гэта знакавая падзея, у першую чаргу — для культуры Беларусі. І, вядома ж, такая кніга па-свойму, цікава і хвалюючa дапаўняе — і ўзбагачае! — своеасаблівы партрэт Санкт-Пецярбурга. Расказаць пра незвычайную работу ў невялікім газетным артыкуле надта цяжка. Таму я, улічваючы спецыфіку газеты, спынюся толькі на некаторых, найбольш адметных, момантах кнігі. Чытаць жа кнігу трэба нетаропка, надзвычай уважліва, бо яна дае шмат матэрыялу для глыбокага роздуму над вельмі няпростым пытаннем: хто мы, беларусы? Як сказаў наш класік: "Што мы ў свеце значым?.."

нікаў і член Прэзідыума Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Член Вучонага савета Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, Праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў горадзе на Няве. Мае ўзнагароды: юбілейны медаль "300-годдзе рускага грамадзянскага шрыфту", ордэн Святога Кірылы Тураўскага 2-й ступені — ад Беларускай Праваслаўнай Царквы.

Я нездарма "даў" некаторыя штрыхі да біяграфіі Міколы Нікалаева. Бо і яго натхненне, самаадданая праца складаюць ужо цікавую старонку гісторыі паўночнай расійскай сталіцы, як і тых нашых землякоў, пра якіх расказвае ў кнізе "Беларускі Пецярбург".

Такой кнізе няма цаны

І вось — аб'ёмная кніга на беларускай мове ажно ў 535 старонак. Выдадзена пры маральнай, арганізацыйнай і фінансавай падтрымцы згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" і асабіста Алены Макоўскай і Ніны Шыдлоўскай, Дома нацыянальнасцей Санкт-Пецярбурга, а таксама пецярбургскіх беларусаў. Сотні змястоўных тэкстаў, найцікавейшых звестак пра нашых землякоў, якія стварылі славу і годнасць паўночнай расійскай сталіцы, а некаторыя робяць і цяпер, мноства найкаштоўнейшых фотаздымкаў. Выдатнае паліграфічнае афармленне, мелаваная папера. Ну што тут сказаць: выданне менавіта такіх базавым паняццям і з'явам народнай культуры беларусаў: амулетам, тканінам, хлебу, жытлу, а таксама абрадавым дзеянням. Алег Лысенка — нястомны арганізатар важных кантактаў з музеямі і вучонымі Беларусі.

А выдатны мовазнаўца Браніслаў Эпімах-Шыпіла? Нарадзіўся ў 1859 годзе ў фальварку Будзькаўшчына на Лепельшчыне. Скончыўшы ў 1880 годзе з залатым медалём Рыжскую Аляксандраўскую гімназію, ён паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Ягонай маці давялося браць пасведчанне аб тым, што сям'я засталася амаль без сродкаў для існавання. Ажно да 1925 года ён пастаянна працаваў у бібліятэцы гэтага універсітэта. Займаўся гісторыяй

Феномен беларускага Пецярбурга

"Беларускі Пецярбург" — так называецца унікальная кніга, якая толькі што выдадзена ў паўночнай сталіцы Расіі. Яна — пра ролю і месца ўраджэнцаў Беларусі ў гісторыі і станаўленні горада на Няве. Аўтар — таксама наш зямляк, апантаны і няўрымслівы вучоны, даследчык Мікола НІКАЛАЕЎ. Думаецца, працу ягоную варта адзначыць словамі Льва Талстога: "Важна заўсёды было і будзе толькі тое, што патрэбна для карысці не аднаго чалавека, але ўсіх людзей". Сёння Мікола Віктаравіч — удзельнік V З'езда беларусаў свету. Акурат да гэтай падзеі свой нарыс пра беларусазнаўцу з Пецярбурга прапануе Міхаіл Шыманскі.

Першае, самае добрае, маё слова — пра Міколу Нікалаева, і гэта зусім апраўдана. Летась мне пашчасціла пабываць у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы, якая знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу. Канешне, зайшлі "ў госці" да Нікалаева. Ён узначальвае аддзел рэдкай кнігі, куды нельга заходзіць без трапяткога хвалявання.

— У аддзеле, — распавядаў Мікола Віктаравіч, — шмат неацэнных скарбаў з культурнай спадчыны чалавецтва. У тым ліку — і з Беларусі, што для нас выключна каштоўна і важна. Да прыкладу — унікальнае выданне Радзівілаўскай (Брэсцкай) Бібліі 1563 года: праз стагоддзі розных гістарычных віхур захаваўся гэты скарб, каб мы, беларусы, маглі карыстацца і ганарыцца ім. Альбо лепшая ў свеце калекцыя кніг на кірыліцы, надрукаваных у Вялікім княстве Літоўскім у часы Францыска Скарыны і Івана Фёдарава, а таксама выданняў XVII і XVIII стст. Сярод 34 мільёнаў адзінак захоўвання — безліч карысных крыніц пра Беларусь, практычна ўсе сачыненні на замежных мовах, прысвечаныя нашай Радзіме…

Шчыра прызнаюся: я слухаў тады Міколу Віктаравіча так, быццам чуў ад яго вобразную і хвалюючую паэму пра найвялікшы цуд, створаны чалавекам, імя якому — Кніга. Тое ўзрушэнне, тая ўзнёсласць, якая валодала маім суразмоўцам, перадаліся і мне, глыбока паланілі маё сэрца. Ах, якая журналісцкая ўдача, якое шчасце, што сустрэў на сваім жыццёвым шляху гэтага чалавека! Асабліві, калі можна так сказаць, каларыт нашай сустрэчы прыдавала тое, што Мікола Віктаравіч цудоўна размаўляе на беларускай мове. Гучала наша роднае слова ў бібліятэцы, гэтай сапраўднай скарбніцы рускай — і не толькі! — культуры, у слаўным Санкт-Пецярбургу, над велічнай і мудрай Нявой…

Штрыхі да партрэта

Што прывяло Міколу Нікалаева ў Санкт-Пецярбург? Далібог, такое наканавана лёсам, і як гэта справядліва і неабходна! Нарадзіўся ў 1955 годзе ў беларускім гарадку Шчучын. Гадаваўся ў вёсцы Нянькава Навагрудскага раёна. Пасля заканчэння гістарычнага факультэта БДУ яму прапанавалі застацца працаваць у Мінску, абяцалі хуткую і добрую кар'еру, бо адчувалі і бачылі ў ім вельмі таленавітага даследчыка.

— Мяне гэта асабліва не прываблівала, — расказвае. — Таму і не застаўся ў сталіцы. Прыехаў у Санкт-Пецярбург, прыйшоў у гэтую бібліятэку, убачыў, колькі тут кніг, ды якіх, — і ўсё: зразумеў, што тут маё месца, маё захапленне, мая мара, сэнс майго жыцця. Не памыліўся, і вельмі задаволены.

Мікола Віктаравіч шмат гадоў даследуе гісторыю сусветнай культуры, беларускае мастацтва, гісторыю Праваслаўнай Царквы. З'яўляецца доктарам філалагічных навук, аўтарам манаграфіі "Палата кнігапісання", прысвечанай пытанням традыцый кніжнай культуры Беларусі, а таксама больш чым 200 публікацый па археалогіі, гісторыі бібліятэк, рукапіснай кнізе, бібліяграфіі... Адзін з заснавальнікаў і член Прэзідыума Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Член Вучонага савета Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, Праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў горадзе на Няве. Мае ўзнагароды: юбілейны медаль "300-годдзе рускага грамадзянскага шрыфту", ордэн Святога Кірылы Тураўскага 2-й ступені — ад Беларускай Праваслаўнай Царквы.

"Калі не я, дык хто?"

Як жа нарадзілася такая творчая задума? Што прымусіла, а больш дакладна — паклікала і натхніла Міколу Віктаравіча на гэтую працу, складанасць і аб'ёмы якой нават цяжка сабе ўявіць?

— Калі шчыра, дык тут, у добрым сэнсе, адыгралі сваю ролю такія мае пачуцці, як непаразуменне, нават крыўда, — расказвае Мікола Нікалаеў. — Мяркуйце самі: Санкт-Пецярбург урачыста адзначае сваё 300-годдзе. Выдаюцца цікавыя кнігі: "Палякі ў Пецярбургу", "Фінскі Пецярбург", "Немцы ў Пецярбургу", "Французы ў Пецярбургу" ды іншыя. Ужо самы назвы гавораць, пра што і пра каго гэтыя даследаванні. А што ж беларусы? — задаю сам сабе пытанне. Дзе яны? Быццам і не прыязджалі на берагі Нявы, не будавалі тут горад, не жылі і не працавалі ў ім, не ўславілі яго. Чаму мы маўчым? Пацікавіўся, мо хто-небудзь працуе ў бібліятэцы, ды паціху, без асаблівай рэкламы, займаецца гэтай тэмай. Не, ніхто. Ну што ж, вырашыў, "вазьмуся" я. Мне, як кажуць, і ўсе карты ў рукі! Ды не карты, а можа Усявышні тады накіроўваў мяне… І я засеў за работу. Тое, пра што даведаўся, што адкрыў, мяне так уразіла, так захапіла, што адразу адчуў: калі не раскажу пра беларусаў у Пецярбургу, дык ніколі сабе гэтага не дарую.

Дзе шукаў і знаходзіў наш апантаны вучоны-зямляк неабходныя матэрыялы? Канешне, найперш — у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы. Яшчэ — у сховішчах бібліятэкі Акадэміі навук краіны-суседкі, у чыім архіве, сярод іншых, — асабісты фонд славутага акадэміка Яўхіма Карскага. Вядома, шмат працаваў у Дзяржаўным гістарычным архіве Расіі. Карыстаўся Мікола Нікалаеў публікацыямі і парадамі мінскіх знаўцаў — Адама Мальдзіса, Віталя Скалабана, Віктара Скорабагатава, Вольгі Дадзіёмавай, а таксама пецярбуржцаў — Валерыя Антонава, Валянціна Грынкевіча, Ігара Мацыеўскага, Тамары Смірновай.

кое, якое і павінна быць на гэтую тэму.

Кніга апавядае пра жыццё і дзейнасць выхадцаў з беларускіх зямель у Санкт-Пецярбургу цягам больш як 300 гадоў. Раздзелы згрупаваны па храналогіі, а таксама прафесійнай прыналежнасці больш чым 2000 выдатных і неардынарных асоб.

Горад гэты, піша ў прадмове да кнігі Мікола Нікалаеў, не вывучаюць у курсе геаграфіі і гісторыі Беларусі… Ведаць больш пра Пецярбург — значыць лепш ведаць Беларусь. Без гэтага горада нельга асэнсаваць феномен беларускай культуры XVIII — XX стагоддзяў, культуры дыяспары, якая назапасіла вялікі патэнцыял.

Толькі некалькі імёнаў...

Менавіта ў Пецярбургу выразна акрэслілася тэндэнцыя пераходу выхадцаў з Беларусі да беларускай самасвядомасці — аб гэтым яскрава сведчыць дзейнасць многіх. Сярод іх, да прыкладу, — выдатны этнограф Аляксандр Сержпутоўскі. Нарадзіўся ў 1864 годзе ў Слуцкім павеце, скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю і Пецярбургскі археалагічны інстытут. У 1906 — 1907 гадах ён арганізаваў экспедыцыі ў Палескія паветы Мінскай і Гродзенскай губерняў, пад час якіх было сабрана больш як 1800 прадметаў традыцыйнага адзення, земляробчых прылад, прадметаў рыбалоўства і пчалярства, зроблена каля 200 фотаздымкаў. Рускі музей пасылаў свайго супрацоўніка А.Сержпутоўскага ў збіральніцкія этнаграфічныя экспедыцыі яшчэ некалькі разоў на працягу 1912 — 1925 гадоў. У выніку з'явілася фундаментальная публікацыя "Сказки и рассказы белорусов-полешуков" (СПБ, 1911 г.) і іншыя кнігі.

Традыцыі А.Сержпутоўскага ў Расійскім этнаграфічным музеі годна працягвае беларус Алег Лысенка (нарадзіўся ў 1955 г. у Полацку). Пасля заканчэння гістарычнага факультэта БДУ ён пераехаў у Ленінград, дзе з 1981 г. працуе навуковым супрацоўнікам аддзела этнаграфіі народаў Беларусі, Украіны і Малдовы Расійскага этнаграфічнага музея. Ён — аўтар шматлікіх публікацый, прысвечаных базавым паняццям і з'явам народнай культуры беларусаў: амулетам, тканінам, хлебу, жытлу, а таксама абрадавым дзеяннням. Алег Лысенка — нястомны арганізатар важных кантактаў з музеямі і вучонымі Беларусі.

А выдатны мовазнаўца Браніслаў Эпімах-Шыпіла? Нарадзіўся ў 1859 годзе ў фальварку Будзькаўшчына на Лепельшчыне. Скончыўшы ў 1880 годзе з залатым медалём Рыжскую Аляксандраўскую гімназію, ён паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Ягонай маці давялося браць пасведчанне аб тым, што сям'я засталася амаль без сродкаў для існавання. Ажно да 1925 года ён пастаянна працаваў у бібліятэцы гэтага універсітэта. Займаўся гісторыяй Полацкай зямлі. Пачаткам дзейнасці Эпімах-Шыпілы стала складанне беларускай хрэстаматыі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ён зрабіў у "Хрэстаматыі" ўсяго некалькі запісаў, сярод якіх — пераклад "Вячэрняй песні" У.Сыракомлі.

* * *

Я назваў толькі трох нашых знакамітых землякоў. Яны звязалі свой лёс з Пецярбургам, каб як мага вышэй узняць годнасць Беларусі. А колькі ж іх яшчэ! Скажам, мастак Валянцін Ваньковіч, родам з Ігуменскага павета, пісаў Аляксандра Пушкіна, з якім быў добра знаёмы. Акадэмік жывапісу Апалінар Гараўскі. Два яго рамантычныя палотны, у тым ліку "Выгляд дубровы на беразе ракі Свіслач", былі ў калекцыі імператара Аляксандра III. У Пецярбургу вучылася і працавала выдатная скрыпачка XIX стагоддзя Тэафіля Юзэфовіч з Гродна, пра якую сучаснікі казалі, што гэта "Паганіні ў жаночай сукенцы". Другім дырэктарам Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі стаў беларус Мікалай Зарэмба з Віцебшчыны. Ці выдатны спявак, саліст рускай оперы Марыінскага тэатра Фёдар Стравінскі, які нарадзіўся ў маёнтку Новы Двор Рэчыцкага павета. Мікола Нікалаеў гаворыць, што яму хацелася б данесці да чытача каларыт розных эпох, таму на старонках кнігі ставяцца нашы землякі (крыху больш за 700 асоб) у атачэнні сучасных ім грамадскіх і культурных падзей і архітэктурных помнікаў, прамысловых аб'ектаў, вуліц, дамоў, плошчаў, вакзалаў…

Як гэта атрымалася — меркаваць чытачу. Што ж да аўтара гэтага роздуму, дык скажу: атрымалася выдатна! Бо кніга — не толькі старонкі, тэксты, розныя даведкі і гэтак далей. У ёй — душа, няўрымслівы творчы пошук, самаадданасць любімай справе, гарачае і поклічнае імкненне нашага земляка яшчэ больш расказаць і паказаць, што такое Беларусь, хто такія яе сыны і дочкі. Хаця яны і жылі ў горадзе над Нявой, але ж родная Бацькаўшчына была заўсёды з імі. Няхай яна заўсёды будзе сёння і з намі…

Міхаіл ШЫМАНСКІ,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі

Камень, бронза, танец

Ацаніць мастацкую вартасць тых ці іншых узораў нацыянальнай скульптуры цяжка, не пабачыўшы іх, так бы мовіць, "жыўцом". У той жа час, прывезці апрацаваныя глыбы граніту ў іншую краіну даволі праблематычна. Тым не менш, знаёмства польскай грамадскасці з сучасным беларускім мастацтвам адбылося ў цэнтральнай выставачнай зале Беластока, размешчанай у будынку ратушы, дзе адбылося адкрыццё экспазіцыі "Сучасная беларуская скульптура: камень і бронза", дзе выстаўлены работы васьмі беларускіх скульптараў, якія прадстаўляюць усе рэгіёны рэспублікі.

У цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел аўтары твораў — вядомыя беларускія скульптары В.Капач, В.Панцялееў, А.Вараб'ёў, Е.Злоціна, А.Старавойтава, прадстаўнікі гарадскога кіравання, інтэлігенцыі Беластока, беларускай нацыянальнай меншасці, супрацоўнікі Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь. Экспазіцыя прадоўжыцца да сярэдзіны жніўня 2009 года.

Гэтымі ж днямі мастацкія калектывы Брэсцкага раёна, у межах развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва ў гмінах Вішніцэ і Канстанцінаў Бяльскага павета, удзельнічалі ў Днях славянскай культуры. У прыватнасці, у Польшчы Беларусь прадстаўлялі народны ансамбль "Дабравест", групы "Лагуна", "Спадчына", "Шакалад" і баяністы браты Круцікавы.

Як адзначаюць у прэс-службе айчыннага пасольства ў Рэспубліцы Польшча, у выкананні мастацкіх калектываў прагучалі песні беларускіх кампазітараў, дэманстраваліся нацыянальныя танцы.

А таксама "Казка..."

На кінастудыі "Беларусьфільм" выпушчана новая анімацыйная казка. У яе аснову пакладзена гісторыя, якую напісаў вядомы расійскі пісьменнік XIX стагоддзя Дзмітрый Мамін-Сібірак.

"Казка пра тое, як жыла-была апошняя Мушка" выканана ў рарытэтнай анімацыйнай тэхніцы перакладкі вядомым беларускім аніматарам Уладзімірам Пяткевічам і яго творчай групай: мастаком-пастаноўшчыкам Ганнай Емяльянавай, аператарам Аляксандрам Бецевым, кампазітарам Віктарам Капыцькам. У агучванні мультфільма прымаў удзел вядомы беларускі акцёр Аляксандр Ткачонак.

Сімвалічная і філасофская гісторыя пра жыццё доўжыцца амаль 17 хвілін і, па меркаванні стваральнікаў, павінна быць цікавай як дарослай, так і маладой аўдыторыі. Як мяркуюць яе стваральнікі, хутчэй за ўсё, новую беларускую анімацыю першымі пабачаць замежныя гледачы на міжнародных фестывалях.

Родная зямлі

У мінскай мастацкай галерэі "Вільнюс" да 15 верасня працуе персанальная выстаўка Валянціны Уласавай "Квітней, родная Беларусь!", прысвечаная Году роднай зямлі.

У экспазіцыі прадстаўлена 40 твораў жывапісу, акварэлі і літаграфіі. Галоўныя жанры — нацюрморт, партрэт, пейзаж. Усе работы ў сукупнасці адлюстроўваюць цудоўнасць, самабытнасць, багацце Беларусі, а таксама ўнутраны свет чалавека.

Ул. інф.

Вядучы рубрыкі — Канстанцін АНТАНОВІЧ

“ВЯЛЕБНЫ КСЁНДЗ”

Падцягнуты, ветлівы, заўсёды некуды спяшаецца. Клопатаў у яго столькі, што адзін-два штодня, праз недахоп часу, застаюцца незавершанымі, але ён абавязкова давядзе справу да канца заўтра. І гэтак — усё жыццё.

Ён — святар, пастаноўшчык рэлігійных урачыстасцей, грамадскі дзеяч, паэт, перакладчык, асветнік, тэолаг, прамоўца, абаяльны чалавек і нават... акцёр. У многіх краінах свету стаў для тамтэйшых беларусаў “тварам” сталічнага Чырвонага касцёла. Як жа звяртацца да ксёндза-магістра Уладзіслава Завальнюка, якому днямі споўнілася шэсцьдзесят гадоў? А так, як ён, кансультант па касцёльных справах 33-серыйнай меладрамы “Пракляты ўтульны дом”, вучыў звяртацца адзін да аднаго акцёраў, што выконвалі ролі каталіцкіх святароў, —

Чырвоны касцёл з юнацтва вабіў мяне: спачатку марыў працаваць на кінастудыі, якая там больш за дзесяць паваенных гадоў месцілася, затым — хацеў стаць сябрам Саюза кінематаграфістаў, што з цягам часу заняў памяшканне. Усё здзейснілася, таму і сцены гмаху мне добра знаёмыя. Неяк, седзячы ў кабінеце Завальнюка, дзе некалі вёў пасяджэнні праўлення Саюза Уладзімір Корш-Саблін, пачуў я ўспаміны і мудрыя разважанні Уладзіслава Мацвеевіча.

***

Для вернікаў Малдовы ў 1970-х смерць блізкага чалавека станавілася адзінай магчымасцю правесці набажэнства. Такім чынам, на пахаванне незнаёмага чалавека збіраліся ў нейкую вёску сотні чалавек: кішынёўскі ж касцёл даўно зачынены, адзіны на рэспубліку стары ксёндз рэдкія імшы праводзіў у капліцы на могілках пад пільным наглядам, але і ён сышоў у лепшы свет...

Новым ксёндзам стаў выпускнік Рыжскай духоўнай семінарыі, што прыехаў у Кішынёў пробашчам храма, якога, па сутнасці, не было. На пачатку 1970-х Завальнюк з’яўляўся адзіным каталіцкім святаром на ўсю Малдову. Распачаліся адстойванне зачыненага касцёла і дзейнасць, накіраваная на ўзвядзенне яшчэ аднаго — на падмурку зруйнаванага.

Цяпер ксёндз прыгадвае пра “малдаўскае” былое з усмешкай. Тады ж яго дзейнасць з’яўлялася небяспечнай. Часам выязджаў ён з Кішынёва ў калясцы матацыкла ў адным, адсочаным міліцыяй, накірунку, а недзе пасярод кукурузнага поля патаемна перасаджваўся ці ў легкавушку, распластаўшыся на заднім сядзенні, ці ў сялянскі воз-каруцу і ехаў іншым шляхам. У калясцы матацыкла тым часам каціла “лялька”... А часам святару даводзілася пераапранацца... ў жаночае адзенне, каб “усыпіць” пільны нагляд. А колькі было налётаў міліцыі на патаемныя набажэнствы ў сялянскай хаце ці ў сутарэнні між вінымі бочкамі!

Зразумела, цярпенне ўлады ўрэшце скончылася: Завальнюка арыштавалі і выслалі за 200 кіламетраў ад Караганды. Але і там святар прадоўжыў сваю місіянерскую дзейнасць: імшу праводзіў, дзе й жыў, — у зямлянцы. На сценах і на падлозе — вада, перакрыцці даху — з жэрдак, на ім — гліна, а зверху — двухметровы пласт снегу. Паўгода — завіруха, што збівае з ног. Але тунелі да падземнага “касцёла” былі заўсёды расчышчаныя.

***

У 1986-м Завальнюк прыязджае ў Мінск, становіцца пробашчам касцёла, які вернікам не належаў. Справа для яго не новая: паўтор кішынёўскай сітуацыі. Амаль чатыры гады ідзе дыялог вернікаў з гарадскімі ўладамі. І ўрэшце Дом кіно перасяляецца ў іншае памяшканне, а Чырвоны касцёл — ужо носячы імёны Святых Сымона і Алены — вяртаецца ў будынак.

Але ў ім прастора па гарызанталі аказалася падзеленай на два паверхі. Таму да якасцей ксёндза дадалася яшчэ “прафесія” архітэктара: увесь двор быў ператвораны ў вялікі катлаван, затым перакрыты плітамі, пад якімі цяпер — бібліятэка, дзве тэатральныя залы, капліцы, выставачныя залы, школа, гараж, падсобныя памяшканні, майстэрні, алтар з копіяй Турынскай плашчаніцы — адной з сямі ў свеце! Словам, сутарэнні Чырвонага касцёла ператвораны ў моцны культурны цэнтр.

***

У касцёле заўсёды шматлюдна. І ўсе, каб спаведацца, чакаюць самога ксяндза-пробашча. Выходзіць ад яго забітая горам жанчына, і сам ён — стомлены, крыху збялелы. Чалавеку стала лягчэй. А ксёндз? Ён павінен выслухаць, суцешыць, даць дзейсную параду. І гэтак — для кожнага. Ведаю адзін з “сакрэтаў” ягонай стойкасці: маці Ганна. Ёй дзевяноста, раніцай і ўвечары яна — у касцёле, моліцца за сына, які моліцца за ўсіх нас. Ён шчаслівы, бо, дзякаваць Богу, ёсць каму называць яго “сынком”.

Вось ужо ў трэцім фільме я пакідаю кадры, дзе бачны засяроджаны твар Ганны ў нязменнай белай хустачцы. Вялікая магія кіно захавае вобраз маці на векі вечныя.

Казані ягоныя выклікаюць водгук, людзі пішуць яму лісты. І не толькі ад блізкасці і зразумеласці думак ксяндза-магістра шырокай аўдыторыі, але і таму, што ён легка пераходзіць з беларускай на польскую, рускую, малдаўскую, літоўскую, латышскую, ведае іншыя еўрапейскія мовы, а набажэнствы вядзе, дарэчэ, на лаціне.

***

Акцёру Горкаўскага тэатра Іосіфу Ражбу, які ў серыяле “Пракляты ўтульны дом” выконваў ролю Старога ксёндза, ішоў 87-ы год. Нейкія бясколерныя вочы, дрыжачая несыходзячая ўсмешка, сівыя пасмы з-пад чорнага берэта, замаруджаная рэакцыя, але — мудрыя парады і сентэнцыі.

І наадварот: выканаўца ролі Новага ксяндза — акцёр Тэатра лялек Аляксандр Васько — сухі, падцягнуты. Выказваў ён жорсткія, энергічна-безапеляцыйныя меркаванні — гэткі тыповы езуіт.

Агледзеўшы акцёраў у Чырвоным касцёле, Уладзіслаў Мацвеевіч загадаў прынесці камплекты адпаведнага адзення: для службы, хатнія і зімовыя. Калі акцёры апрануліся, доўга пазіраў на іх, а потым шапнуў мне:

— Яны больш за мяне падобныя на ксяндзоў.

Паводле сюжэта, для 30-й серыі спатрэбіўся выканаўца ролі Прыезджага ксяндза. Яму належыла справіць імшу па гаспадары Дома. Кансультант павінен навучыць гэтаму нейкага акцёра... Але тут шчаслівая думка падказала мне прапанову:

— Велебны ксёнжа, лічу, лепей вас самога ніхто не выканае ролю.

Ён наадрэз адмовіўся. Але яшчэ не ведаў, якая яна, настойлівасць рэжысёра, апантанага ідэяй! Угаворы былі доўгімі і скончыліся тым, што я пакінуў яму сцэнарый 30-й серыі.

З веданнем тэксту прыехаў ён у вёску Варонча (па паданні, яе апісаў Міцкевіч у “Пане Тадэвушы”). Там, у цэнтры сучасных могілак з абавязковымі кратамі-агароджамі, цудам захавалася з паўсотні помнікаў, якім па 100, 150 гадоў і болей... Іграць Уладзіславу Мацвеевічу не было патрэбы: імша, потым — размова з галоўнай гераіняй, Саламеяй, дзе ён супакойвае і настаўляе дзяўчыну, якая страціла жыццёвую абапору:

— Няма пустэчы... І быць не можа!.. А калі пусцее душа, яе тут жа запоўніць цемра. Ты згодная са мной?

Гэта была ўжо чыста акцёрская задача, якую выдатна вырашыў Завальнюк...

Уладзімір АРЛОЎ, кінарэжысёр
Фота з архіва аўтара

І маёнткі, і млыны

Цэнтральная частка Мемарыяла.

253 камяні Памяці

30 чэрвеня адкрыўся Мемарыял “Памяці былых вёсак” непадалёк ад Снежкава Вілейскага раёна. Усяго такіх населеных пунктаў у гэтым рэгіёне Міншчыны — 253.

Розны лёс напаткаў іх у XX стагоддзі. Большасць зніклых паселішчаў сёння засталіся хіба ў памяці старэйшых людзей. Не пакінуў час пра іх ні здымкаў, ні ўспамінаў колішніх жыхароў.

Вялікі пералік ужо саміх тыпаў зніклых паселішчаў. Гэта маёнткі — зямельнае ўладанне памешчыка з панскай гаспадаркай, фальварак — невялікая сядзіба пана, аколіца, ці засценак, — невялікае сельскае паселішча дробнай шляхты, хутар — адасоблены сялянскі зямельны ўчастак разам з сядзібай уладальніка, калонія, ці таварыства, — новае сялянскае пасяленне выхадцаў з іншых мясцовасцей, а таксама леснічоўкі, чыгуначныя або шасэйныя будкі, асады, вадзяныя млыны... Знікалі і вёскі, у тым ліку вялікія. Напрыканцы 1930-х было ліквідавана паняцце такога буйнога населенага пункта негарадскога тыпу, як мястэчка.

Існуе некалькі прычын знікнення нашых шматлікіх паселішчаў, і амаль ва ўсіх выпадках прысутнічае чалавечы фактар: людзі выбіралі па сваёй волі ці праз збег абставін новае месца жыхарства.

Вілейшчына панесла страты і з-за адсялення шэрагу вёсак з зоны затаплення Вілейскім вадасховішчам, якое пачалося на пачатку 1970-х гадоў. У выніку ажыццяўлення гэтага мерапрыемства пад хвалямі штучнага вадаёма цалкам ці часткова апынуліся месцы, дзе раней віравала вясковае жыццё. Гэта дзевяць населеных пунктаў: Альшанка (Лазарцы), Вольшына, Касуцкае, Малмыгі, Рыбчына, Сенішча, Слабада, Сутокі, Пахомава. Апошняя вядомая тым, што ў пачатку XIX стагоддзя тут пражываў дзед славутага авіяканструктара Паўла Сухога. Незайздросны лёс напаткаў гэтую вёску. Двойчы цягам Вялікай Айчыннай яна была спалена немцамі, але ацалелыя жыхары адбудавалі яе. У 1970-я гады, калі пачалося будаўніцтва вадасховішча, вёска была затоплена.

План-схема Мемарыяла.

Многія са зніклых сядзіб былі ў мінулым калыскай інтэлігенцыі, крыніцай творчага натхнення выдатных дзеячаў навукі і культуры не толькі нашых, але і суседніх народаў. Не абмінула гэта і Вілейшчыну. Сярод іх — Ганута — маёнтак Агінскіх, Дзевятні — месца, дзе правёў большую частку свайго жыцця класік польскай і беларускай літаратуры Ігнат Ходзька, Крыстынопаль — тут жыў і пахаваны беларускі паэт-дэмакрат, фальклярыст Адам Гурыновіч.

Адкрыўшы Мемарыял “Памяці былых вёсак”, віляйчане здзейснілі сваё вяртанне. І дапамагалі ў гэтым не абыякавыя да духоўнай спадчыны людзі. Канцэпцыя мемарыяла не ўзнікла стыхійна — яна нарадзілася ў час традыцыйных сустрэч, якія штогод ладзяць былыя жыхары непадалёк ад месца, дзе знаходзілася вёска Рыбчына. Палымнеючы пялёсткамі шыпшыны, луг на беразе Вілейскага вадасховішча стаўся для іх своеасаблівым сімвалам мінулага, у чым спляліся ўспаміны і сучаснасць. Падалося, што менавіта такі сімвал павінен быць у кожнай зніклай вёсцы. І калі гэтай ідэяй захапіліся адначасова старшыня раённага Савета дэпутатаў Яўген Ігнатовіч, вядомы краязнаўца Анатоль Рогач і архітэктар Анатоль Капцюг — нарадзіўся праект, дзе цэнтральнае месца адводзілася абрысам вясковай хаты.

На пад’ездзе да Снежкава арганічна ўплёўся ў бярозавы гай арыгінальны па кампазіцыі мемарыял, якога яшчэ не даводзілася бачыць на прасторах нашай Радзімы. Яго пачаткам стаў камень у выглядзе перакуленага звона з назвамі пяці населеных пунктаў Вілейшчыны, што напаткаў лёс Хатыні. Драўляная скульптура ахопленай полымем жаночай постаці дапаўняе кампазіцыю. Так тэму роднай зямлі ўскалыхнуў матыў роспачнага болю нашчадкаў на папялішчах той страшнай вайны.

Трынаццаць сельскіх саветаў Вілейскага раёна сімвалізуюць трынаццаць камянёў, якія размяшчаюцца па дзвюх спіралях. На кожным камені — мемарыяльная шыльда з назвамі зніклых вёсак. Яшчэ адзін камень змяшчае пералік вёсак, якія ўліліся ў рысу Вілейкі. Цэнтральнае месца займае 15-тонны валун са зваротнымі словамі да наведвальнікаў.

На бетонным слупе — кола для буслянкі, сімвала вечнага і шчаслівага жыцця. Яно павінна быць менавіта такім у нашчадкаў зніклых вёсак.

Сяргей ГАНЧАР,
дырэктар Вілейскага краязнаўчага музея

Два храмы Скарыны

Гіпотэзы

Ініцыялы з выданняў Ф.Скарыны з’яўляюцца своеасаблівай маленькай энцыклапедыяй сімволікі, якая была вядома яго адукаваным сучаснікам.

Напрыклад, выявы касачоў праз аманімію лацінскага “iris” указваюць на вясёлку, якая з’яўлялася вядомым сімвалам Нябеснага Царства.

На ініцыялах з пражскіх прадмоў выява канюшыны (“trifolium”, “трёхлистник”) праз лічбу “тры” сімвалізуе Бязмежны Розум. Адметна, што ў адным са старажытных англамоўных манускрыптаў кветка канюшыны намалявана на ініцыяле, які пачынае слова “разумны”. Адзначым, што англійскае “clever” — “разумны”, а “clover” — “канюшына”. Медыявістам добра вядома пра тое, што сярэднявечныя багасловы выкарыстоўвалі так званыя псеўдаэтымалогіі слоў, якім надаваўся статус безумоўнай даказальнай сілы.

Сучасная сімволіка літары “ікс”, падобнай на кірылічную літару “Х” і рымскую лічбу “10”, узыходзіць да сімволікі невядомага абстрактнага Бога — пачатку ўсяго (адзінкі), з’яднанага з абсалютным небыццём (нулём) яго для органаў пачуццяў чалавека. Стваральнікі кірыліцы добра ведалі пра гэта. Назва літары “Х” узыходзіць да яўрэйскага слова, ад якога паходзіць слова “храм”.

Ініцыял літары “Х” упрыгожаны выявай саадака. Праз лацінскае “comu” (“лук”, “рок”, “маладзік”) лук сімвалізуе Маісея і іудаізм, калчан — Біблію, а стрэлы — словы з яе. Другі ініцыял гэтай жа літары аздоблены выявай мяча і шчыта (вядомыя метафары з тэксту Біблії). Наяўнасць на апошнім выявы “сонейка маладзіковага” цалкам нівелюе існуючыя павярхоўныя трактоўкі гэтай “зброі”.

На самых складаных ініцыялах выкарыстоўваецца сімволіка круга і яго сегментаў. Круг — сімвал бясконцасці ў трыадзінстве Мінулага (ніжняя палова), Цяперашняга (гарызантальная рыса паміж паловамі круга — так званы “Гарызонт адвечнасці”) і Будучага (верхняя палова). Акрамя выданняў Скарыны, гэтая сімволіка выкарыстана ў візантыйскім манускрыпце пачатку XIV стагоддзя, А.Дзюрэрам (“Мадонна з касачом” і нават С.Далі (“Нязменнасць памяці”).

Ідэаграму Будучыні можна заўважыць на славутым партрэце нашага асветніка пад яго правай нагой, якая абапіраецца на маленькую лавачку. Ножкі апошняй, выкананыя ў выглядзе паўкружжа, не маюць аналагаў у гісторыі мэблі. Сімвал жа Мінулага змешчаны ў верхняй частцы ініцыяла літары “амега” з выявамі аголенай жанчыны (Канчатковая недасягальная Абсалютная ісціна) і чэрапа (Неба). На гэтым сімвале (Мінулае) адлюстравана першапачатковая іскра неаплатонікаў, у рэнесансных манускрыптах якіх, поруч з выявамі капы пшаніцы (“мэта”, “фініш”, “узнагарода”), сустракаюцца выявы крэсіва і іскры.

Мікалай ПАЛКОЎНІЧАНКА
Гомель

Кітлік і нажутка

"Кітлік", "нажутка", "наржутка", "шнуроўка"... Старажытныя назвы, нязвыклыя для нас. Адкуль яны ўзяліся? Што абазначаюць? Аказваецца, так раней называўся прадмет жаночага адзення — безрукаўка. "Прымерыць" яе ды іншыя модныя ў мінулым прадметы адзення і запрашаем сваіх чытачоў "К".

Па-дэ-суа ці дамасэ?

У Беларусь і Літву комплекс безрукаўкі і спадніцы, відавочна, трапіў з Заходняй Еўропы праз Польшчу ў XVII ст. А ў XVIII — пачатку XIX стст. святочнае адзенне з парчы і шоўку — кароны, безрукаўкі і спадніцы — з'яўлялася прыналежнасцю касцюма мяшчанак на Віцебшчыне. Шырока выкарыстоўваліся пластычныя ўласцівасці парчовых тканін, шоўку. Жанчыны апраналіся ў тканае золатам адзенне — нягнуткае, цвёрдае, як быццам выкаванае, а не вытканае. Безрукаўка з парчы, пашытая "у аблiпку", падкрэслівала прыгажосць жаночай фігуры. Карона з парчы (з шоўку з "бліскаўкамі") зззяла, як сонейка, як і шырокая атласная спадніца.

Тканіну для шыцця святочнага адзення куплялі на кірмашах. На Віцебшчыне ў XVIII — XIX стст. найбольш буйныя кірмашы праводзіліся ў Бешанковічах Лепельскага павета. Тканіну прывозілі з Расіі: парчу надта складаных і разнастайных малюнкаў, падобныя да яе глазет (гласет), брокат, для фабрыкацыі якога ўжываліся шаўковыя ніткі, абвітыя залатымі або сярэбранымі. Везлі ў наш край тафту, што насіла шмат розных назваў: люстрын, градэнапль, пу-дэ-суа, шаўковыя рыпс у "рубчык" і штофы з разводамі. Прапаноўвалі "адамашку гвоздиковую" — старажытная назва выраблёнай у Дамаску тканіны дамасэ: з буйнымі ўзорамі ды чаргаваннем бліскучых і матавых паверхняў. Прадавалі атлас "шкарлатное масці" — гэта значыць чырвонага колеру. І пакупнікі цікавіліся шыкоўнымі аксамітамі. Парчовыя ўзорыстыя і залачоныя тканіны выраблялiся і на мануфактуры князёў Радзівілаў. Іх везлі з "града Слуцка". З імем графа А.Тызенгауза звязана развіццё мануфактурнай дзейнасці ў Брэсцкай і Гарадзенскай эканоміях, дзе выраблялі сукно, палатно і шоўк. У Паставах ім былі заснаваны ткацкія майстэрні. З даматканага палатна і мануфактурнага паркалю рабілася падкладка для святочнага адзення.

Існавалі розныя віды ўпрыгожвання адзення. Часам шаўковая тканіна аздаблялася бліскаўкамі — маленькімі кружкамі з накладнога золата або срэбра, з адтулінай пасярэдзіне для прышывання (цяпер такія бліскаўкі вядомыя пад назвай "пайеткі"). Нязменна карысталася папытам аздабленне пазументам — звычайна прынята так называць пераважна залаты або сярэбраны басон — мішурную (медную, алавяную) тасьму, павязку, ашалёўку, аблямоўку, галун. Сюды адносіцца і аграмант — узорныя "плетешки" са шнуркоў для аблямоўкі жаночага галаўнога ўбору, "витейки", "витушки". Адзенне з бліскучай парчы і ўзорчатага шоўку ўпрыгожвалася карункамі — плеценай "дзірчастай" стужкай, тасьмой з нітак, паперы, шоўку, золата, якая плялася або ткалася.

Гэта далёка не поўны пералік тавару, што прапаноўвалі гандляры пакупнікам і пакупніцам, якія маглі пафранціць сваімі ўборамі перад суседзямі. Усё гэта куплялі гараджанкі, жыхары мястэчак ды сяляне, каб пасля прынесці краўцам, якімі ў той час звычайна былі яўрэі па нацыянальнасці. Праз іх у беларускую вёску прыходзілі гарадскія фасоны і тыпы крою разам з назвай "кітлік". Дарэчы, у якасці прадмета святочнага адзення сялянак іх і апісвае этнограф М.Нікіфароўскі.

Як носіцца адзенне, "выкаванае" з золата?

Саф'ян і саян-сарафан

Маладая жанчына ў поўным камплекце мяшчанскага касцюма паказана на літаграфіі "Наряд купчихи м. Усвята Витебской губ. в 60-х годах" у кнізе "Река Западная Двина" А.Сапунова 1893 года. Добра перададзена фактура тканіны касцюма: цвёрдасць парчы на безрукаўцы, шырокія, цяжкія складкі на спадніцы, снежная белізна, лёгкасць кісяі кашулі, яркі арнамент на высокім галаўным уборы. Тонка прапісаны ўсе ўпрыгожанні: завушніцы, тры нізкі караляў з круглых пацерак, брошка і пярсцёнкі. Каралі на жанчыне былі тымі самымі "пярловымі маціцамі", пра якія пісаў М.Нікіфароўскі, — каралі з фальшывых і сапраўдных жамчужных зярнятак. Чым больш было на шыі іх скруткаў, тым больш багата, прыгожа і заўздросна для іншых выглядала мясцовая "щеголиха".

Жанчына апранута багата, густоўна, нават з вытанчанасцю. У кнізе ёсць дадатковае апісанне прадметаў убору купчыхі: "Хустка" — платок, повязанный "купцом", "закруткой"; "завушницы", "крали" — кораллы, красные бусы, иногда жемчуг; "китлик" — корсаж из парчи и шелковой материи; саян-сарафан, "юпка", на ногах — непременно сафьяновые башмачки... Точно такой же наряд, с незначительными изменениями, носили купчихи и зажиточные мещанки Велижа, Суража, Витебска и Полоцка".

Букет з шаўковых валошак

У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі захоўваюцца прадметы з калекцый К.К. Бергнера, В.П. Федаровіча і А.Р. Брадоўскага. У этнаграфічным аддзеле апынуліся рэдкія асобнікі адзення гарадскога, мяшчанскага ўжытку мінулага часу. Захавалася фатаграфія мяшчанкі з суседняга з Бешанковічамі мястэчка Ула, зробленая М.Кусцінскім у 1860-я гг., на якой паказана жанчына ў высокім галаўным уборы, абшытым парчой і галунамі. Падобныя галаўныя ўборы мяшчанак апісаны ў дакументах музейнага архіва:

"Женский головной убор из парчи, обшитой красивым позументом <...>, снизу подшит холстинкой" — быў пашыты з "золотной" парчы, у арнаменце тканіны — кветкі і галінкі (Маскоўская мануфактура, апошняя чвэрць XVIII ст.). Вакол абшыты пазументам, нашыты на кардон. Унізе, пасярэдзіне — мыс.

Або іншыя апісанні: "Тоже из парчи, но более узкий, на концах — по 3 крючка и по 3 петли" — быў пашыты з "золотной" парчы канца XVIII ст. У клеймах — невялікія букеты кветак (тканіна Маскоўскай мануфактуры). Форма блізкая да дзявочага вянца — кароны, падбітай светла-карычневым ласцікам (ці паўатласам) — баваўнянай матэрыяй атласнага перапляцення.

"Тоже из тафты, с узорами, вышитыми блестками, битью и канителью". Пашыты з шаўковай тканіны, па валошкавым рубчастым полі "золотной" ніццю вытканы арнамент у выглядзе рыбнай лускі. Па паўпарчы вышыты бліскаўкамі.

Хто — у падвічцы, хто — у кароне

Галаўны ўбор з вострым верхам з фонду музея ў пачатку 80-х гг. ХХ ст. этнограф М.Раманюк вызначыў як "карону" — вясельны галаўны ўбор "дзяўчыны-мяшчанкі, накшталт падвічкі, выраблены з парчы і расшыты бліскаўкамі". Галаўны ўбор замужніх жанчын "падвічка" існаваў у Ляхавіцкім раёне Беларусі, "падвіку" — галаўны ўбор з хусткі, каптура або шапкі — насілі ў Польшчы.

Пад час вясельных абрадаў у ваколіцах Віцебшчыны жаніха і нявесту называлі "князь" і "княгіня": "Гэта і пры Мікалаі было, як Мікалай цар быў, мая ж матка тады "кінягінілась". "Кінягінілась" — ад "княгіня", гэта значыць "нявеста"; "кінягініца" азначае ўзроставы перыяд, калі маладзіца знаходзіцца на выданні. Падобны зварот да жаніха і нявесты быў характэрны і для некаторых раёнаў Расіі. У Валагодскай губерні, да прыкладу, вянчальны галаўны ўбор зваўся "коруна", у каруне маладзіца сядзела на вясёлым банкеце. Каруну выразалі з бяросты і абцягвалі дарагой тканінай, упрыгожвалі, ззаду прымацоўвалі шырокую паласу парчы.

"Кітлік" для "щеголихи"

Безрукаўка і спадніца на згаданай літаграфіі нагадваюць прадметы з фонду музея. У калекцыі знаходзяцца кароткія безрукаўкі розных фасонаў і спадніцы, пашытыя з дарагой мануфактурнай тканіны. На Віцебшчыне мяшчэовыя безрукаўкі называліся "шнуровка", "китлик", "наржутка". "Шнуровка" — род лифа без рукавов, зашпиленная на боку с левой стороны груди на 3 крючка ("гоплика") <...>, делалась из <...> тяжелой материи... обшивалась галуном" (Суражскі павет, Каралеўская воласць). Назва "китлик", відавочна, прыйшла ад яўрэйскага насельніцтва ("кітл" — "белае адзенне, якое апранае асоба ва ўрачыстых выпадках").

"Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии" этнографа М.Я. Нікіфароўскага 1895 г. утрымліваюць маляўнічае апісанне: "Китлик" есть именно та шнуровка, о которой сохранились песенные упоминания: "Прадай, маця, ялывицу — купи мине шнуровицу". Вядома, такая безрукаўка каштавала нятанна. Набыць тканіну, аплаціць працу краўца каштавала вялікіх грошай, да таго ж, шыццё безрукаўкі планавалася ў самы адказны перыяд: "Китлик" справлялся раз в девической жизни и донашивался потом в первые годы замужества... Зажиточные щеголихи справляли "китлик" из парчи; лица же победнее шили его из какой-нибудь яркой материи или из лучших домотканок".

Тканіны для шыцця гэтага віду адзення былі самымі лепшымі, краўцы выкарыстоўвалі выкрайкі і меркі: "Овальные выкройки в белье и простейшей одежде не имеют места", только "китлики" кое-где составляют исключение: для них имелись кое-какие бумажные выкройки или мерки из бумажных и холстинных полос. Но это важивалось у заведомых закройщиц и портних, к которым и обращались носительницы "китлика".

(Заканчэнне будзе.)

Святлана САЛАЎЁВА,
навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея

Фота Валерыя ШЫШАНАВА

На здымках: 1. Карона. XVIII — пач. XIX ст. Паўпарча. Вышыўка металічнымі бліскаўкамі, каніцеллю. Палатно; 2. Карона. XVIII ст. Парча. Палатно; 3. Безрукаўка. Карона. XVIII ст. Парча. Палатно; 4. Юбка. XVIII — пач. XIX ст. Атлас. Баваўна; 5. Карона. XVIII ст. Парча. Палатно; 6. Безрукаўка. XVIII — пач. XIX ст. Парча. Палатно; 7. Безрукаўка. XVIII — пач. XIX ст. Шоўк. Вышыўка металічнымі бліскаўкамі. Пазумент; 8. Юбка. XVIII — пач. XIX ст. Шоўк. Палатно.

АК Афіша "К"

з 18 ліпеня — да 25 ліпеня 2009

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РБ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

- Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
- Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
- Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
- Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі беларускіх мастакоў 1940-х — 1980-х гг.
- Выстаўка **"Слуцкія паясы".**
- Выстаўка **"Вобраз іранскай жанчыны"**.
- Выстаўка, прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, **"Палітра памяці"**.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея РБ:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.".

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

- Выстаўка фотаздымкаў XIX ст.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.

- Выстаўка Л.Нішчык **"Міфы Беларусі"**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. Раўбічы

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка дзіцячай творчасці.

МУЗЕЙ ВІТОЛЬДА КАЭТАНАВІЧА БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:

- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст.".**
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**

Выстаўкі:

- **"Халодная і агнястрэльная зброя".**
- **"Саксонская люстра" і Магдэбургскае права — асновы Еўропы".**
- **"Крыніцы адвечнай прыгажосці".**
- **"Выратаваныя каштоўнасці".**

Дом-музей I з'езда РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 72 61.

Выстаўкі:

- Выстаўка, прысвечаная 85-годдзю А.Савіцкага.
- **"Спадарожнікі дзяцінства".**
- **"Хата — мой сусвет".**
- **"Жыццё Л.М. Талстога ў фатаграфіях сучаснікаў".**
- Выстаўка музейных прадметаў XI — XX стст. з фонду музея **"Вякоў мінулых успамін...".**

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Праект інтэрактыўнай карты: **"Вызваленне Беларусі"** *(хроніка вызвалення і мультымедыйная прэзентацыя аперацый Чырвонай Арміі па вызваленні Беларусі ў верасні 1943 — ліпені 1944 гг.).*

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца Румянцавых і Паскевічаў

Выстаўкі:

- **"Агнястрэльная і халодная зброя краін свету"** (выстаўка макетаў).
- **"Гонар мундзіра".**
- **"На радзіме А.А. Грамыкі".**
- **"Французскі раман XIX стагоддзя".**

адзення.

- **"Пратакольныя падарункі".**

Экспазіцыі:

- **"Культавыя прадметы".**
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны".**
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** *(грот палаца).*
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Гісторыка-мемарыяльная экспазіцыя

- **"Гравюра XVII — пачатку XX стст.".**
- **"Паэзія XVIII — пачатку XX стст.".**

Паўночнае крыло палаца

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Лакальныя экспазіцыі ў санітарным вагоне; у партызанскай зямлянцы.
- Пастаянная выстаўка ваеннай тэхнікі.
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- У выставачнай зале: **выстаўка новых паступленняў з фондаў музея.**
- У выставачнай зале: **"Палітра памяці".**

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

- **"Памяць сэрца".**

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

- Дыпломныя працы студэнтаў кафедры народнай творчасці БДУКіМ.

ГАЛЕРЭЯ ТЫЗЕНГАУЗА

г. Гродна, пл. Тызенгауза, 4. Тэл./факс: (8–0152) 72 27 57.

- Выстаўка, прысвечаная памяці мастака **С.Субізава.**

КАРШІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4. Тэл.: (8-0232) 77 75 20.

Экспазіцыі:

- **"Г.Х. Вашчанка".**

Выстаўкі:

- Выстаўка фатаграфіі **Штэфана Капелькама** (Германія) **"Мясцовы час".**
- Выстаўка фатаграфіі **Міхаіла Баразны і Кацярыны Кенінсберг (Мінск) "Тлумачальны слоўнік".**

Паважаныя чытачы!

ІДЗЕ ПАДПІСКА

на газету "Культура"
Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752;

на часопіс "Мастацтва"
Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 74958, ведамасная падпіска — 749582.



НА ЖНІВЕНЬ І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2009 ГОДА!

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

- Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя I-га з'езда РСДРП".**
- Выстаўка **"Ваенныя, суровыя, простыя..."**

Экспазіцыі:

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:

- **"Праект "Беларусь". Трыумф Пераможцаў"** (да 65-годдзя вызвалення Беларусі).
- Праект **"Сабакі на службе Айчыны".**
- **"Нараджэнне і адраджэнне".**
- **"Аляксандр Гайлевіч. 20 гадоў творчасці".**
- Выстаўка работ сусветна вядомага куцюр'е **Вячаслава Зайцава**: карціны, фотаработы, мадэлі

Выстаўкі:

- **"У цэню дрэваў, над ракой"** *(фотаздымкі птушак і вавёрак Гомельскага парку фотааматара Яўгена Шастакова).*
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**
- Працуе куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

- Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ТЭАТРЫ*

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, тэл./факс: 334 11 56. (пл. Парыжскай камуны, 1)

- **Тэатр знаходзіцца на гастролях.**

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. тэл./факс: 334 60 08.

- **Тэатр знаходзіцца на гастролях.**

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

- **Тэатр знаходзіцца на гастролях.**

МАЗЫРСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР ІМЯ І.МЕЛЕЖА

г. Мазыр, вул. Ленінская, 23. Тэл.: (8–02351) 211 31.

- **Тэатр знаходзіцца на гастролях.**

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 418
Галоўны рэдактар — Людміла КРУШЫНСКАЯ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Аляксандр РАШЧУПКІН, Барыс СВЯТЛОЎ, Рычард СМОЛЬСКІ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.

Спецкарэспандэнты:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Наталля КІРПІЧЭНКАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77.
Тэлефон: (017) 289-34-66 (прыёмная) (017) 286-07-97,
Тэлефон/факс: (017) 334-57-23 (017) 334-57-35.
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"**
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0494414 ад 17 красавіка 2009 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 289-34-66. Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.

© "Культура", 2009.
Індэкс 63875
Наклад 9498
Падпісана ў свет 16.07.2009 у 18.30
Замова 3815
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
Пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

ISSN 1994-4780